Уладзімір Караткевіч

SHOUT
SHARE
IT

- Уладзімір Караткевіч
  - Абдуванчык на кромцы вады
  - Людзям простым к добраму навучанню
  - Гэта было 10-га сакавіка 1864 года…
  - З вадой і без вады
  - Коласаўцы
  - Мова (што я думаю пра цябе)
  - Наш агульны клопат
  - Родная мова
  - Ці дажывем да ста год, або пасмяротнае рыданне
- notes
  - 1

Уладзімір Караткевіч
Артыкулы

Абдуванчык на кромцы вады

Ёсць у вялікага мастака М. К. Чурлёніса карціна "Спакой". Апалогія раўнавагі. Вялікі светавы акіян настолькі ціхі, што каля самай кромкі вады паспеў пабялець і не абсыпацца абдуванчык.

Спакой даўно. Прарос, зрабіўся маленькім залатым сонцам, пасля — апушыўся, пасля — рассее свой род па ўлонні зямным.

Як у каго, але ў мяне гэтая карціна выклікае адзіную думку: наколькі ж я моцны. Як я ўсё магу. Захачу — сякерай пад камель тысячагадовы дуб. Захачу — разаб'ю вялізны, як хата, валун. Захачу — па бярвенцы, па каменьчыку разнясу першую — лепшую крэпасць. Дзесяткі тысяч рук узводзілі піраміду Хеопса. А ў мяне дзве рукі і (пакуль па іх не далі) шар-баба, дынаміт, мелініт, трасца і хвароба. І — выбуховай сілы папера ад нейкага… гм!.. геадэзіста, што шаша павінна прайсці якраз праз такі і такі будынак, адкрыты кар'ер ляжыць якраз пад каранямі дубовага гаю, які памятае часы Шэкспіра або нават Цэзара.

Паперыну можна павярнуць, як дышаль, куды ты хочаш. На месцы рэліктавага лесу пабудуваць прафілакторый (мой!) або крэматорый (мой!), як быццам побач няма месца.

Як быццам нашчадкі калі яны толькі захочуць (а я да таго часу даўно ўжо буду безабаронны) не знясуць усяго. што толькі захочуць, каб насадзіць на тым месцы сваё.

Псуюць нашу памяць, каб нехта пасля сапсуў іхнюю.

Выйсце, відавочна, адзінае: перастаць ганарыцца сваёй сілай (на тваю сілу заўсёды знойдзецца іншая), перастаць бачыць саперніка ў тваім продку, каб нашчадкі перасталі бачыць саперніка ў табе.

Дыялектыка ў тым, што для добрага — калі гэта зроблена добра — заўсёды знойдзецца месца. Побач са старым і новым.

Дыялектыка ў тым, што і абдуванчык на кромцы вады, вядома, безабаронны.

А ты на кромцы жыцця?

Сутнасць у тым, што ты зрабіўся занадта моцны. Я вось так аднойчы штурхнуў проста далонню дрэва. Ды, відаць, трапіў у нейкую там "амплітуду", і яно ўпала. А ў ім было некалькі гнёздаў! І птушкі над гэтымі шкарлупінамі галасілі дужа "сілне і слезне".

Мне была забава, а ім…

Ёсць гэтаму жывыя сведкі. А самы няўмольны — мая памяць і маё сумленне.

Не хочаш, каб нехта вось таксама, не думаючы штурхнуў тваё

існаванне — не штурхай сам.

Ты дасягнуў такіх неймаверных магчымасцяў, што жах уявіць. Ты сапраўды (па праву ці без права) — "цар прыроды" (ох, як мне хочацца пры адным слове "цар" узяцца за маю добрую пушчанскую доўбню!). Ты ўсемагутны. І менавіта таму, што ты ўсемагутны, асабліва цяпер, засвой першы прынцып культуры: умей абмяжоўваць сябе. Нават калі гэта ў нечым табе асабіста пашкодзіць.

Не грабі далонню, шкробай, жменяй — лепей аддай. Будзеш багацейшы за Крэза, бо прыдбаеш раўнавагу ў гэтым свеце, які цябе стварыў і якому ты павінен як мага аддзячыць.

Гэта вельмі простае крэда: жыві ў поўнай раўнавазе з прыродай, маці тваёй, пакінь, урэшце, бачыць у ёй ворага (а то, як бач, яна ўбачыць яго ў табе, і табе ж будзе горай), з якім трэба безупынна ваяваць адстойваючы права на існаванне.

Яна на тваё права на існаванне руку не заносіць. Калі ты, вядома, разумны і пяшчотны палюбоўнік. А калі ты добры палюбоўнік (а значыць, каханы), навучыся асцярожнасці, максімальнай абярэжнасці у сваім каханні.

Вось пляжаць лес, ідзе молевы сплаў, аголены схілы яроў, плыве аглушаная рыба, хвошча ў раку вада са сцёкавай трубы, пэцкае дымам неба завод.

Гэ, мілы, ды ты гвалтаўнік! Там, дзе можна ўгаварыць, ты робіш злачынства горшае, чым забойства.

Глядзіце, вось яры, кар'еры, звалкі!

У нас столькі яшчэ пустых, продкамі калісьці спустошаных пустошных фактычна зямель. То, можа, спачатку прывучыцца аднаўляць іх? Прывучыцца браць спаўна з таго, што ў нас ёсць? Не разменьваць дзесятку на шклянку газіроўкі, калі ў цябе ў кішэні ёсць капейка.

Ледзь не самы горшы чалавечы грэх — скупасць! І тая ж самая скупасць — адна з найбольшых чалавечых вартасцяў, калі справа ідзе пра кішэню грамадства. Не "мой рубель", а "мой, твой, ягоны".

Бярыце з таго, што ёсць. Не адбірайце нічога ў лясоў, паплавоў, у жывёл і птушак, якія жывуць там.

Ведаю, што ўсе гэтыя ламентацыі (а па-нашаму, па-простаму — лямант) могуць не дайсці па адрасу. І таму давайце проста звернемся да вашага здаровага сэнсу, да таго, што вы не проста "гаспадарнікі". Гэта вас прызначылі — гэта вас і зняць могуць. Але ніхто (і найперш — ваша сумленне) не здыме вас з пасады мужоў, бацькоў, таварышаў. Гэта ваша пажыццёвая (і нават пасмяротная) пасада. Пакуль можаце — служыце ёй.

Браслаўшчыне, Прыпяці, Дняпру, Гарыні — вячэрняму пылу

на дарогах, па якім вечна ступаць босым чалавечым нагам!

Вы і вашы ўнукі жывяце для гэтага. Чалавек запраграмірaваны для свежай вады, абмытай дажджом зеляніны, чыстага паветра. І таму калі мы хоць у дробязі нявечым адзіную, раз і назаўсёды нам дадзеную біясферу — мы нявечым саміх сябе.

Могуць спытацца: "А чаго ты гарлаеш, чалавека, калі гэта і так усім вядома?" Так, "усім вядома". Але існуе на свеце такая рэч, як чалавечая легкаважнасць.

"Ну, паступлюся ў дробязі. Вунь, сусед ваюе. І другі. І трэці".

"Так, і соты ваюе. Ён храбры дзядзька. А я яму буду біць у ладкі". Ды не біць у ладкі трэба там, дзе і ты сам прыклаў сілу. Чым ты будзеш біць у ладкі, калі ты склаў рукі. І падумай, калі ты ўжо звыкнуў думаць толькі пра сябе, што кожная ўпушчаная табою дробязь на табе і адгукнецца.

Атручаная "хіміяй" пчала, разбітая кімсьці аб камень бутэлька — і вось дзеці твае не пабягуць босыя па траве, не загартуюцца, будуць не вылазіць з пнеўманіі, не атрымаюць пад час крызісу лыжкі паўнацэннага мёду.

Перабольшанне? Дурасць? Не такая ўжо і дурасць, як падумаць.

…Колькі ж нас яшчэ, "легкаважных"?! тых, якія гавораць пра "сінія крэсачкі, што пярэсцяць карту". Пра балоты, якія, як гэта ні дзіўна для беларуса, таксама ўжо трэба бараніць. Бо падае ўзровень грунтавых вод, сям-там перасушваюцца землі (і — парадокс! — лютуе паводка), знікаюць мясціны, дзе нараджаліся аблокі, у некаторых гарадах адчуваецца голад на ваду (за сто кіламетраў ты правёў канал, дзе не трэба, або ссек дрэва над крыніцай), няма рэчкі, дзе ты плаваў дзіцем (Куцеянка пад Оршай), гінуць звяры і птушкі.

А маральная шкода? Ішлі мы калісьці пад час вяселля прыяцеля над Волмай. Начная рака пахнула рыбай, зоркі гарэлі ў водах і на беразе. Гэта былі светлякі… І вось нядаўна я трапіў туды і ўбачыў просты, як страла, канал, у якім няма месца нават для пячкура.

Сын прыяцеля не ўбачыць ужо, што бачылі ў тую ноч мы. Пячкуры ў гэтым канале не будуць пакусваць яго за пальцы на нагах, калі ён будзе вудзіць, стоячы ў вадзе. Ён проста не палезе туды вудзіць.

І можа, у гэтым чалавеку менавіта з гэтай прычыны памёр паэт, і людзі засталіся абкрадзенымі. Перабольшанне? Абдуванчык на мяжы вады? Магчыма. А можа, і не?

"Лёгка табе казаць такое, калі табе не трэба дбаць пра…" Ну, па-першае, мне заўсёды даводзілася пра гэта дбаць. І не толькі пра сваю асобу.

Справа ў тым, што чалавеку, вядома, трэба есці і піць. Яму толькі не трэба браць там, дзе потым немагчыма будзе аддаць. Неабходна разабрацца, ці ёсць "да канца шкодныя жывёлы", "пустыя сабе" рыбы, ці ёсць увогуле на зямлі ні навошта не патрэбнае пустазелле. Трэба быць страшэнна абачлівым (а гэта цяжка, але неабходна). І проста добрым.

А то ты добры ў хімгасе ці ў шахце. У цябе ў руках выбуховыя рэчывы, ты сочыш, каб твае людзі не падарваліся. А тое, што часткай "выбухоўкі", якой ірвуць карчы, тыя ж людзі падарвалі рыбу ў Друці — на гэта табе наплявать.

Заплаціў за паляўнічы білет — ну і ўсё. А дзе такія жывёлы, як тур, балотная рысь, чорны заяц? На гербе горада Копыся? Хіба што толькі на гербе…

Сціпла апранутая жанчына (а стукнуў раптам люты мароз) несла па вуліцы ў Оршы вялізны марлевы хатуль, з якога ва ўсе бакі тырчала нешта вострае, фіялетавага колеру.

— Што гэта, цётачка?

— А… Я, ці ведаеце вы, прыбіральшчыца ў школе… Шпакі… Мароз… То дзеці іх штук трыста падабралі ды грэлі, ды трымалі ў класе… Нясу вось трэці хатуль дадому… Бо там — нельга… Панапіваліся чарніла, аж дзюбы сінія…

Відаць, трэба сяму-таму браць прыклад з прыбіральшчыцы. І калі ўжо ставіць помнік "вартавым прыроды", то я паставіў бы на п'едэстале побач з Лютэрам Бёрбанкам тую бабулю з хатулём.

Не будзем баяцца слоў "паратунак прыроды". Што не скіравана на знішчэнне прыроды, тое ідзе на яе ўратаванне. Справа ці ведаеце, зусім не ў адзіным дзяржаўным органе аховы (хаця і добра, што такі ёсць). Справа ва ўсіх людзях, у іхнім беражлівым трыманні жывога на далоні. Справа ў бабулі-арнітолагу, схіленай над гняздом, у грамадскіх інспектарах па ахове прыроды, якія мерзнуць недзе на беразе старыцы, каб не дазволіць нікому (а ёсць такія аматары) перадчасна стрэліць па вывадку кражных качак, калі хлапунцы яшчэ не падняліся "на крыло". Я не супраць азарту (сам мог скочыць па падбітую качку ў дрыгву замест сабакі), але з узростам разумееш усё лепей, што і па табе лёс можа секануць, і нават не бакасіннікам, а жаканам, што самы лепшы азарт — гэта быць у школьным лясніцтве недзе пад Цырынам, пераносіць на новае месца мурашнікі пад Оршай, прывіваць вучням у школе любоў да пушчы, каб з іх не выраслі драпежнікі, падгадоўваць аленяў недзе ў Белавежы, выхоўваць пільных і добрых егераў. Што там слава нейкага зверабоя Буфала Біла, які знішчыў некалькі тысяч бізонаў! Ты зрабі так каб на месцы аднаго лася, аднаго бабра — тры. Ты малады і славалюбны — вось яна, твая слава: садзіць сады на палескіх пясках, што нейкі

дурань выпусціў калісьці на волю, зберагаць паркі ў Нясвіжы, Вялікім Мажэйкаве, Канстанцінаве.

Таму што ўся гісторыя кожнага народа ёсць гісторыя паступовага зведання ім сваёй Радзімы, асваенне і ўпрагожванне яе, асэнсаванне самога сябе як чалавека на гэтай зямлі.

Сохне ў горадзе хваёвы парк. Бывае, як, скажам, пад Кругліцамі, турысты запаскуджваюць лясы. Стань і падумай: твае каравыя рукі лепей манціруюцца не з тапарышчам, а з пушыстай хвояй маладых сасонак. І ўлічы: сасна сохне ад шуму, ад клаксанаў, яна не любіць галасу горш, чым ты, калі ў цябе інфаркт. То чаму ж блізкія берагуць цябе, а яе — не? Дай спакой абдуванчыку на кромцы вады, ты, абдуванчык.

…Страшныя яры кіламетраў за пяць на поўдзень ад Карэліч. Проста нейкі беларускі Дагестан. Сюды нельга было прывесці ў пасаг карову з раўніннай вёскі. Мясцовыя каровы будуць насмельваць таварку, штурхаць яе пысамі ("Чаго баішся? Ідзі! Не бойся!"), яна ўпадзе, ногі паломіць. Жудаснае відовішча!

А ты проста не прымірыся з гэтым. Знішчы эрозію, гэтую праказу зямлі. Пасадзі там вербы (проста забі вярбовы кол у зямлю) і таполі — хай трымаюць каранямі гэтую зямлю.

Або вялікае воднае наша багацце. "Краіна дваццаці адной тысячы рэк і адзінаццаці тысяч азёр".

Гучыць? Яшчэ як гучыць! А яшчэ калі прыпамінаеш кожную рэчку і кожнае возера "ў твар"? Вялікі Нёман, прабацька Дняпро і ягоныя жонкі — Прыпяць і Бяроза (ён — язычнік, яму можна), светлая сястрыца Дзвіна. І, па ўсёй Беларусі, слязіны азёр.

Толькі не кожная вада — вада. Вада толькі тады вада, крыніца і калыска жыцця, калі яна — частая. І тут кожнаму трэба памятаць, што ніякія тытанічныя намаганні гідрахімічных лабараторый, якія сочаць за гэтай празрыстай чысцінёй, ніякія старанні інжынераў, скажам, таго ж Наваполацка па будове ачышчальных спаруд і прыстасаванняў (каб ніжэй нафтаапрацоўчага завода ў чысцюткай вадзе брохала вечарамі рыба), ніякія водныя сістэмы (каб ліквідаваць жарсткаваты водны баланс некаторых гарадоў) не дапамогуць, калі кожны чалавек не перастане засмечваць ручаіны і крыніцы, ператвараць нават самую малую рачулку ў прыёмнік сцёкавых водаў.

Як ніякія лесаводы, батанікі, заолагі і паляўніцтвазнаўцы, ніякія школьныя лясніцтвы не дапамогуць, калі кожны турыст, курортнік, грыбнік, паляўнічы распяражацца ў нашым лесе, як п'яны вандал у захопленым Рыме.

А наш лес не горад, аддадзены салдатні на паток і разрабаванне. Ён — наш храм, наш гонар і, пры выпадку, наш паратунак, як гэта было ў вайну. А раз ён храм і ўратавальнік, то і

паводзь сябе, як у храме або ў хаце ўратавальніка.

Але вернемся на сваё балота. Балота — "праклён", балота — "чума гэтай зямлі". А ўспомнім толькі тое, што большасць нашых буйных рэк (а колькі малых?) бярэ пачатак у так званых верхавых балотах. І калі іх асушаюць — мялеюць рэкі, сохнуць малыя рэкі і навакольныя студні, падае ўраджай. Таму што балота — рэзервуар вады на лета, балота — маці аблокаў і забойца засушы. Адзін Палескі, адзін Бярэзінскі запаведнік справы тут не ўратуюць. А балотныя ж сітнягі могуць у многім замяніць дрэва пры вытворчасці дэфіцытнай паперы. А журавіны, сабраныя з аднаго гектара балота, у два разы больш каштоўныя чым драўніна з гектара спелага, мачтавага бору.

Але што ўсё выгада ды выгада? А захад, які дагарае над балотам, а звон косаў у касьбу, а скокі вячэрніх журавоў на балоце? Глядзіце, колькім жывёлам, птушкам, раслінам дае жыццё і прытулак гэты "праклён"!

Без ежы, пад наглядам лекара, можна жыць і месяц, без вады — пару дзён, без паветра… Ды што там, без яго мы не толькі задыхнуліся б, але й замерзлі, памерлі ад радыяцыі. І вось мы, радуючыся "фабрыкам дымным", забыліся, што вось ужо ў гэтым паветры і пыл, і попел ад вугалю і сланцаў, і серавадарод, і вокіслы азоту. За год у паветра трапляе паўтара мільёна тон пылу толькі ад цэментавых заводаў! А аўтамабільныя выхлапы, а лясныя пажары… А пяцьдзесят тон пылу і сажы, што асядае толькі на Мінск… Гэта, вядома, чысцей, чым над Лонданам і Чыкага, таму што памеры не тыя, дый барацьба з забруджваннем паветра ў нас вядзецца. Але ўсё ж кепска, бо чалавек усё разумее, ды робіць далёка не ўсё.

Вядома, ты не ў змозе весці барацьбу з забруджваннем адзін. Гэта справа дзяржавы: ставіць апараты для ўлоўлівання попелу, цэментавага і іншага пылу, пераводзіць прадпрыемствы на газавае паліва, электрыфікаваць дарогі і дамы, рабіць цыклонныя топкі. Твая справа — падаць сігнал, калі недзе нешта не ўсё ў парадку.

Але ёсць род дзейнасці, дзе ты і адзін у полі воін. Хай кожны пасадзіць і дагледзіць хаця б адно дрэўца ў год — і вось на барацьбу з "дымнай чумою" выйдзе толькі ў Мінску мільён, а па ўсёй Беларусі — дзевяць мільёнаў трывалых зялёных воінаў. Воінаў, якім мы абавязаны тым, што мінскае, гродзенскае, гомельскае паветра ўсё ж чыстае! Кожны год забяспеч гэтаму зялёнаму легіёну падмацаванне — і ён адолее ўсё. Не будзь ворагам братняму войску, якое выйшла бараніць твае лёгкія, тваё жыццё.

Зусім мала: толькі адно дрэўца за сябе, адно за свайго нямоглага дзеда і адно — за сваё яшчэ някемнае дзіця. І ты

забяспечыш дзеду больш здаровую старасць, сыну — нармальнае развіццё, сабе — даўжэйшы век. А яго другі раз табе не дадуць, наконт гэтага будзь пэўны.

Ваюй, дзе можаш. Бо гэта адзіная вайна, якую варта весці. Садзі дрэвы ля вадаёмаў, не давай без патрэбы валіць ніводнага дрэва, падымай голас за павелічэнне тэрміну забароны вясновай лоўлі рыбы, за мэтазгоднасць промыславай лоўлі толькі з канца лета, каб паспела аднераставаць і ўзмацнець каштоўная рыба.

І шкадуй галасістых і пёрыстых братоў сваіх, брат "двуногі і без пер'я" (паводле трапнага вызначэння Платона). Бо, вядома ж летам і восенню неба над маці тваёй Беларуссю звініць ад спеву крылаў, нашы паляўнічыя далёкія ад таго, каб, скажам, страляць у дразда, бусла, шпака, чайку, але ж вадаплаўнай, баравой, стэпавай дзічыне куды горш.

Наўрад ці многа знайшлося б на Беларусі паляўнічых больш заядлых і азартных, чым я. Бадай што, не было такога звера ці птушкі (акрамя, вядома, тых, паляванне на якіх забаронена), на якіх бы я не выходзіў. І вось гадоў пятнаццаць назад я, назіраючы за меліярацыяй, высечкай хмызоў, ляснымі гарамі, разгулам браканьераў, усур'ёз задумаўся і ўрэшце вырашыў: што датычыцца мяне — досыць! Ні ў каго і ніколі я больш не адбяру стрэлам жыцця, хіба ў шалёнага ваўка.

І, ведаеце, ахвяра мая выявілася больш лёгкая, чым я думаў. Спачатку, праўда, усе рэдактары лаяліся, што ў маіх "Каласах" зашмат сцэн палявання (а гэта была проста спроба пазбавіцца ад неадчэпных праяў, спроба галоднага набіць рот тым, што пад руку трапіць, ад чаго — смею спадзявацца — мой чытач не дужа многа страціў). Цяпер я "палюю" сваімі вачамі, кадрамі ў маім фотаапараце або з нажом у кошыку на грыбным "ціхмяным паляванні". Мне цяпер больш цікава і куды больш сумленна жыць.

Звяры і птушкі па-ранейшаму вакол мяне, але яны жывыя. І куды цікавей, паверце, бачыць такаванне цецерукоў, чым уварвацца туды несправядлівым наканаваннем, шротам, пухам і крывёй.

Трэба, каб ва ўсіх лясных гаспадарках, а не толькі ў некаторых, не секлі дуплаватых дрэў (гэта чыясьці магчымая кватэра), не палілі на балотах траву (гэта чыёсьці сховішча), не пасвілі ў лесе быдла (гэта чыйсьці знішчаны "хлеб"), абмяжоўвалі збор грыбоў і ягад (іх ясі не толькі ты, і для цябе яны — прысмакі, а для звера — жыццёвая неабходнасць).

Ды ўсё гэта і асабіста ў тваіх руках таксама. Кармі птушак зімой, арганізоўвай ім "галечнікі", каб маглі "купацца". Нават "нікому не патрэбных" мухамораў не збівай нагамі, бо звяры ядуць іх перад зімой, каб выгнаць паразітаў і лягчэй перажыць галодную

сцюжу. Нават арабіну ў сваім кветніку не абірай да рэшты — хай крыху з'ядуць або абтрасуць на зямлю (гэта запас на вясну, калі сыдзе снег) птушкі, якім яна, магчыма, паратунак.

Ёсць, вядома, і такое, што знішчаюць нават будысты, якім забаронена забойства ўвогуле. Усе гэтыя кольчатыя шаўкапрады, сасновыя клапы, матылі-манашкі, яблыневыя молі і г.д. Дык вось, калі ты ўжо жывеш па прынцыпу "размахніся, рука", то размахніся гэтай рукою на іх. А іх, дарэчы, нямнога сярод тых, што жыццём сваім дораць нам карысць і прыгажосць. І вельмі-вельмі асцярожна звяртайся да хімікаліяў, нават у сваім садзе. Гэта ж праўда, што ў 1969 годзе пры "атручванні лазы" на Прыпяцкім узбярэжжы здараліся выпадкі атручвання нават буйной фауны. Я сам бачыў дохлых качак, буслоў, нават ласёў.

Не разбурай нават мурашніка — гэта добрая форма чужога жыцця. І, галоўнае, не жыві ў гэтым свеце інтарэсамі свайго ведамства.

Тваё ведамства — увесь свет вакол цябе.

"Усё ўва мне, і я ва ўсім".

Не шкодзь старому парку ў тваёй вёсцы, нават калі ён не пад аховай дзяржавы (такіх мала), не шкодзь жывому — можаш учыніць непапраўную згубу. Апошні зубр быў забіты ў Англіі ў XII стагоддзі. У Швецыі ў XVI, а ўвогуле збярогся ў свеце толькі дзякуючы тым зубрам, якія калісьці былі вывезеныя з Белавежы.

Ну добра, зубр уратаваны. І многія яшчэ звяры, птушкі, насякомыя. Схапіўся чалавек. А ўвогуле ж і цяпер яшчэ каля шасцісот відаў звяроў і птушак на шляху да вымірання. Наладзіла чалавецтва гэткі звера-птушыны генецыд замест таго, каб падкормліваць, лекаваць, ствараць новыя месцы для жытла: спрадвечную, але і выпраўленую, разумна скіраваную гармонію жыцця.

Забіць, як я гэта даўно зразумеў, - непрыгожая і паскудная штука. І ніколі на паляванні мне не было так лёгка і радасна, як, скажам, на адлове баброў, для перасялення іх у новыя, незайманыя вадаёмы. Як ён, выпушчаны, яшчэ не верыць волі, як пасля імкнецца да вады, як прагна, доўга, упарта пялёхаецца, плавае, нырае (жарцікі — суткі не мыўся!), мые футра, не зважаючы на блізкасць людзей і сабак! І як ён потым спакойна плыве некуды ў ціхія воды, да захаду, у бляклую стужку вячэрняй заранкі…

Змывае вячэрняй вадой і спакоем свае "бабровыя слёзы".

У такія хвіліны адчуваеш з гонарам, што ты — чалавек, створаны прыродай і роўны з ёю.

Шчаслівыя, незабыўныя імгненні! Лепей, чым стварыць новы верш. Хіба што верш пра тое самае:

"Я стал доступен утешенью;
За что на бога мне роптать,
Когда хоть одному творенью
Я мог свободу даровать!"

Гэта пісаў паэт ссыльны і паднявольны.

…Вось так. Гэта ўсяго два словы, ды болей і не трэба. Зберажы роснае павуцінне ў асеннім прасветленым лесе, дай старому дубу распачаць наступнае стагоддзе, памажы звярыне, якая з такой мужнасцю, праз вякі, цягнула свой род у барацьбе з ворагамі, самым моцным з якіх яшчэ ўчора быў ты.

Затулі сабою ад ветру слабенькі і моцны абдуванчык на кромцы вады.

Хопіць, урэшце. Мір усім на гэтай чыстай зямлі пад вечнай вясёлкай у гэтым чыстым і вечным небе.

Людзям простым к добраму навучанню

475 год з дня нараджэння Георгія[1] Скарыны, выдатнага дзеяча беларускай культуры, вучонага, заснавальніка кнігадрукавання ў Беларусі і Літве

Канец пятнаццатага — першая палавіна шаснаццатага стагоддзя.

У Францыі будуюць замак Шэнано паблізу Блуа. Ствараюць свае творы, пранікнутыя ідэямі прагрэсу, паэты Кляман Маро і П'ер Рансар, працуе над раманам "Гарганцюа і Пантагруэль" Франсуа Рабле.

У Германіі пакутліва шукае навуковую праўду Парацельс, Лютэр стварае свае "дзевяноста пяць тэзісаў", а паветра напружанае атмасферай Сялянскай вайны, ідэямі Томаса Мюнцера.

У Англіі Т. Мор марыць аб дзяржаве справядлівасці, але яшчэ не нарадзіліся на свет бацькі Шэкспіра.

У Іспаніі зараджаецца гарэзлівы раман.

Свежы вецер праносіцца над светам. Адраджаецца разуменне дэмакратыі. Людзі прагна спрачаюцца аб філасофіі, літаратуры, этыцы. Людзі прачнуліся, яны бачаць прыгажосць зямлі і самых сябе.

"Мы народжаны не для жывёльнай долі,
А к доблесці і ведам народжаны".

Мацнее і пашыраецца разуменне слова "гуманізм". Але адразу ж паяўляюцца і яго шматлікія ворагі. Пачынаецца бязлітаснае праследванне думкі. Цемрашальства люта супраціўляецца руху чалавечага духу ўперад. Небяспечна нават "Біблія", няхай нават малазразумелая, на лацінскай і стараславянскай мовах. Каб не сапсавацца ў розуме і веры, яе трэба слухаць толькі з вуснаў свяшчэнніка і з яго каментарыямі.

Пагалоўная бязграматнасць. Голад. Прыгнечанне. Фанатызм. Маравая пошасць. Чалавек няшчасны, як ніколі. І толькі палацы і саборы ўзносяцца да неба сярод убогіх хацінак.

Жудасная рэчаіснасць, і з ёю не маглі згадзіцца найлепшыя розумы гэтага часу. Не мог з ёю пагадзіцца і чалавек, які нарадзіўся ў гэтыя дні, у 1490 годзе, на беларускай зямлі, у Полацку, чалавек, увесь жыццёвы шлях якога быў шляхам

барацьбы за "доблесць і веды", за ўмацаванне каштоўнасці чалавечай асобы ў свеце, за шчасце ўсіх людзей у сваёй роднай краіне.

Георгій Скарына — першадрукар не толькі беларускай, але і ўсяе ўсходне-славянскай кнігі. Вучоны, асветнік, змагар, нястрымна прагнучы ведаў чалавек.

Жыццё ў сучаснай яму Беларусі было адносна яшчэ нядрэнным. Прыгоннае права яшчэ не зусім скавала народ (толькі праз 98 год пасля яго нараджэння яно было канчаткова афармлена юрыдычна). Ёсць яшчэ свабода сумлення (няхай агранічаная), ёсць мова, ёсць магчымасць адысці ад дрэннага феадала на вольныя землі. Але дзень хіліцца да захаду, і, усё роўна як бачучы гэта, сын заможнага купца шукае ведаў, святла, не можа без агіды думаць аб наступаючай ночы… Жадае барацьбы з ёю.

Ён сын стагоддзя. Культура стагоддзя — культура, афарбаваная рэлігіяй. І гэты чалавек хоча, каб людзі свядома разбіраліся ў жыцці, а не зубрылі, як папугаі, усялякія догмы на незразумелай для іх мове. "Бог пусціў мяне ў свет з гэтай мовай", і гэтая жывая мова павінна стацца мовай кнігі. Гэтай, якой яшчэ няма, якая зараз неймаверна дарагая, знявечана перапісчыкамі, незразумелая.

Кнігадрукаванне, "Мастацтва над мастацтвам, навука над навукамі" (Гуценберг), існуе ў Германіі толькі 50 год, у Іспаніі — сорак, у Жэневе і Лондане — каля трыццаці, калі паглынаючы прагай навукі вандроўны шкаляр атрымоўвае ў Кракаве дыплом бакалаўра сямі вызваленых навук і адпраўляецца ў шасцігадовае вандраванне па Еўропе.

За плячыма — два гады навукі, прафесар Глагоўскі і, магчыма, знаёмства з Капернікам.

Спераду — дарогі, клунак, Пражскі універсітэт, бадзянні па нямецкіх гарадах.

У 1512 годзе беларускі юнак прыйшоў у Падую, дзе універсітэт слаўны сваім медыцынскім факультэтам. Бацька яго да гэтага часу памёр. Скарына "незвычайна вучаны, але бедны" па думцы віцэ-прыёра, доктара Мусаці. Бясплатна дапушчаны да экзамену на доктара медыцыны (ён ужо мае ступень доктара вызваленых навук), Скарына вельмі добра здаў яго.

І зноў гады бадзянняў і неадчэпная думка аб кнізе для свайго народа. Не проста перакласці біблію, але даць яе народу "на роднай мове". Ён здабывае грошы, шукае майстроў, заказвае шрыфты, знаходзіць мастакоў і гравёраў. Справа новая. Ніхто яшчэ не выдаваў бібліі на роднай мове (нямецкая біблія паявілася ў тым жа годзе, што і біблія Скарыны, у 1517 г.). Ён перакладае,

наладжвае работу. Ён друкар, ён і карэктар.

6 жніўня 1517 года выходзіць "Псалтыр". У 1517–1519 гадах — дваццаць дзве часткі "Бібліі" на роднай Скарыне мове.

Георгій ведаў нямецкія інкунабулы, кнігі Фіёля, рукапісныя кнігі родных мясцовасцей. Але сапраўдны чалавек заўсёды імкнецца да дакладнасці. Кнігі Скарыны — не проста кнігі на зразумелай мове, яны яшчэ і ўцяшэнне для вока, сапраўднае цуда паліграфіі тых гадоў. Яны незвычайна прыгожыя, і рускі мастацтвазнаўца В. Стасаў свайго часу скажа, што яны "лепшыя за ўсё, створанае падобнага роду ў Бібліі". Мала таго, гэта не "кнігі-цары", убраныя ў золата і жэмчуг, неймаверна цяжкія, а кнігі — працаўнікі, кнігі- сябры і спадарожнікі кожнага дня, у дарозе і дома. Выдадзены ў чвэрць ліста, адносна танныя і даступныя, са смакам ілюстраваны, каб людзі "чытаючы маглі лепш разумець", зразумелыя сваёю моваю — яны займаюць адно з першых месц сярод першадрукаў.

Ілюстрацый у іх, на тыя часы, вельмі многа (у адным "Пяцікніжжы Майсеевым" іх дзевяць, і сярод іх такое маленькае цуда, як "Дачка фараона, якая выймае Майсея з вады"), не гаворачы ўжо аб шэдэўрах застaвак, гербаў, тайнапісных знакаў, манаграм і раслiннага арнаменту. Тэхніка гравюр — вельмі добрая. Яны цудоўныя і, у той час, чулліва наіўны. Вось царыца Саўская перад Саламонам. Ніякая тут Палесціна. Гэта сярэдневяковая Беларусь паводле адзення, твараў, будынкаў. Выдавец, вядома, разумеў гэта, але лічыў, што такім людзям будзе больш зразумелым.

І вось Іудзіф у адзенні багатай гараджанкі і двухручны меч, які наўрад ці магла паднесці. А галава Алаферна прыпамінае вусамі і ўсім іншым галаву беларускага магната, ды і названы ён "ваяводай".

Усе кнігі маюць прадмовы, разважанні Скарыны аб жыцці і людзях. Трэба лічыць, за іх, як і за зразумелую для простага чалавека мову, — ненавідзелі выдаўцу як "лаціністы-католікі", так і "царкоўнаславіністы-праваслаўныя". Таму што ў гэтых прадмовах раз-пораз прарываецца гуманізм, ласкавасць да людзей, клопаты аб іх шчасці і адукацыі. Вось ён гаворыць аб царах у прадмове да кнігі "Эсфіль". Асур — "усе землі падбіў пад уладу сваю. І ўсё ж ніколі не хацеў ператвараць у зло вялікай сілы сваёй. Але дабратой думкі заўсёды правіць сваімі падданымі. Каб без усялякага страху, у цішы жылі, у згодзе, якой усе людзі жадаюць…"

Мала было міру ў гэтыя часы. Не было такіх цароў. І таму клопаты аб людзях, смутак аб іх няшчасцях хвалююць Скарыну.

Ён ведае, што людзі родзяцца, каб думаць і сумнявацца. Ні

думкі, ні сумнення не можа быць там, дзе ставяць перашкоды палёту розуму. Галоўная перашкода — амяртвелая чужая мова. І ў канцы "Кнігі прарока Данііла" ён гаворыць аб роднай мове, прызнанай памнажаць хвалу Богу і дабру на зямлі. У імкненні быць зразумелым нават найбольш неадукаванаму, ён часам вялікі і чуллівы. Вось Саламон у "Песні песняў" параўноўвае грудзі каханай з гранатам. Скарына дык бачыў гэты плод у Італіі, і на дрэвах, і ў руках мадон. Але астатнія — яго суайчыннікі не бачылі. І вось паяўляецца "яблыка зярнятае". А ў "Кнізе Руф", такой простай і зразумелай, ён часта зрываецца на простанародную мову.

Ён паэт і ў гэтых прадмовах раз-пораз пераходзіць на вершы, няхай іншы раз чароўна-наіўныя, але гэтыя вершы — першыя вершы ў Беларусі, прычым не фальклорнага характару. Скарына называе чытанне "люстэркам нашага жыцця, пацехай усім маркотным", асабліва тым, хто "у бедах і немачах". У прадмовах ён стараецца даць людзям як мага больш звестак з геаграфіі, гісторыі, музыкі. Разумеючы, што ўсё гэта пахне абвінавачаннем у ерасі, ён праяўляе і дыпламатычны талент, бо гаворыць жа аб месцазнаходжанні сонца і астраноміі "Кніга Ісуса Навіна".

Значная частка тыража "Бібліі" прапала. Туга за радзімай пацягнула Скарыну з Прагі. Па дарозе ён заехаў у Віценберг, дзе прапаведваў Лютэр. Каталікі абвінавацілі першадрукара ў адносінах з ім, і амаль не прысудзілі да спалення. Скарыне ўдалося апраўдацца. Кнігі ж, таму што яны былі зразумелыя ўсім і, такім чынам, былі зброяй д'ябла, спалілі.

Ён перанёс і гэты ўдар. Вытапталі ніву — зноў засей яе. У Вільні, у доме бургамістра Якуба Бабіча, на гэты раз на радзіме з яе прыгажосцю і беднасцю, дзе гучыць родная мова, і навокал браты, ён арганізуе новую друкарню. У хуткім часе выходзяць "Апостал" і "Малая падарожная кніжыца", усе на тым жа высокім паліграфічным узроўні і таксама прыгожа, страсна, пяшчотна і грубавата перакладзены.

А потым — маўчанне. Амаль губляюцца сляды. Новых кніг няма. Разарэнне. Багатым мяшчанам і выдадзенага надта хапае. Ідуць цяжкія часы. У 1580 годзе агонь паглынае дзве трэція горада і друкарню. Праз тры гады прыходзіць чума. Ноч яшчэ далёка, але на твары ўжо начныя цені.

Ён зрабіў што мог. Даў суайчыннікам друкаванае слова на сваёй мове, а значыць, аснову для школы на гэтай жа мове, для асветы, для вялікай чалавечнасці. Ён пачаў адраджэнне на сваёй зямлі, ён верыў, што навука нясе патрэбныя ўсім мір і спакой. Ён лічыў, што яго кнігі не толькі грамата, але і аснова для сямі вызваленых навук, для разумення свету, якім ён ёсць. Ён быў

чалавекам сярэдневякоўя, як Дантэ, якога тады ў Беларусі, акрамя яго, Скарыны, ведалі толькі адзінкі. І, у той жа час, ён быў чалавекам будучыні.

Жыццё яго — ланцуг няшчасцяў і смутку. Але справу, зробленую ім, ужо нельга было задушыць ніякім гарам, ніякімі агнямі. Таму што яго кнігамі пачалося трыумфальнае шэсце кнігі па землях усходніх славян. Друкароў забівалі, друкарні палілі. Дык кнігу лёгка спаліць — два-тры ўдары крэсівам. І ўсё ж зноў і зноў грукатаў прэс друкарскага станка і на месца адной кнігі станавілася дзесяць новых.

1561 — Украінская перасопніцкая "Евангелія". 1562 — Беларускі "Катэхізіс" Сымона Буднага і "Евангелія" Цяпінскага, 1564 — Маскоўскі "Апостал" Івана Фёдарава, 1568 — Заблудаўскі, Беларускі "Апостал". 1570 — там жа "Псалтыр". Дзесяткі. Сотні. Тысячы. І вось ужо старонкі свецкіх кніг шалясцяць у руках людзей. У 1575 годзе Пятро Мсціславец адраджае справу Скарыны ў Вільні. Грукочуць друкарні Мамонічаў у Кутсіне, Магілёве. Што абазначае іх грукат? І, аднак, сцены замкаў і засценкаў уздрыгваюць ад яго.

Як і кожны сапраўдны сын сваёй зямлі, Скарына горача любіў сваю радзіму. Ён пісаў: "…Паколькі ад нараджэння зверы, якія ходзяць у пустыні, ведаюць ямы свае. Птушкі, яція лётаюць у паветры, ведаюць гнёзды свае. Рыбы, якія плаваюць па моры і ў рэках, ведаюць ямы свае. Пчолы і ім падобныя ахоўваюць вуллі свае. Таксама і людзі, дзе нарадзіліся і выгадаваныя… да гэтага месца вялікую любоў маюць".

Ён жыў любоўю да ўсіх простых людзей, да ўсіх народаў і жадаў ім дабра і свету. Ён быў у шэрагу тых, хто прапаведваў і закладаў асновы вялікага братэрства на зямлі. У цёмныя дні яны падавалі руку ўсім людзям добрай волі ва ўсім свеце. Яны шукалі праўду і чалавечнасць, змагаліся за іх і гінулі, у пагібелі здабываючы перамогу. Светачы сярод галечы і цемры, першыя агні, нашы продкі, справу якіх мы прадаўжаем і вобраз якіх захоўваем у сэрцы.

Гэта было 10-га сакавіка 1864 года…

Да 100-годдзя з дня смерці Кастуся Каліноўскага

Спатрэбілася дзве роты салдат, каб схапіць аднаго чалавека. Была цёмная і снежная ноч 29 студзеня 1864 года. Салдаты абкружылі квартал Святаянскіх муроў і распачалі планамерны вобыск.

Чалавек жыў адзін. Аб яго месцазнаходжанні ведалі два-тры бліжэйшыя сябры. Каб не здрада — яго нельга было б знайсці. Ён лічыў за лепшае рызыкаваць толькі сваёй галавой. Калі ўжо здарыцца бяда — хай з яго смерцю перарвуцца галоўныя ніці падпольных тайн. Але ў горшае ён не верыў. Сам шчыры, просты і адданы справе паўстання, ён верыў у нязломную цвёрдасць людзей, якія рабілі з ім адну справу.

Дзве роты салдат і адзін чалавек. Салдаты абкружалі Святаянскія муры ў Вільні. Пачаўся пошук чалавека, які кіраваў адсюль паўстаннем у Беларусі і Літве, не даючы згаснуць полымю. Рататаваў самае каштоўнае — сяброў, братоў, людзей. Дамагаўся, каб вясною паўстанне выбухнула зноў…

Чалавек ішоў сходкамі насустрач салдатам, несучы свечку ў руцэ. Так яны і сутыкнуліся. Адзін нёс святло. Другія выраслі са змроку.

— Як ваша прозвішча?

— Вітажэнец, — спакойна адказаў малады чалавек.

Яго схапілі за рукі. Агеньчык скаціўся па каменных прыступках. Згаснуў.

Уласна кажучы, гэта быў канец. Бо ні на допытах, ні на судзе чалавек не зрабіў нічога, каб палегчыць сваю долю. Чалавека павесілі на Лукішскай плошчы ў Вільні.

Яго звалі Кастусём Каліноўскім, і за тыдзень да страшнай ночы 29 студзеня яму мінуў дваццаць шосты год. За такі час большасць людзей паспявае зрабіць мала. А гэты паспеў стварыць вольную беларускую прэсу, пасеяць насенне народнага гневу, узрасціць яго і зжаць пасеў. Спачатку ён кіраваў паўстанцамі Гродзеншчыны, а потым усклаў на свае юныя плечы паўстанне ўсёй Беларусі і Літвы. І калі белае панства здрадзіла і пакінула ўзброены народ, Каліноўскі ўзначаліў яго і неймавернай сілай волі трымаў гэты цяжар пяць месяцаў.

Што гэта азначала, можна ўявіць хоць бы з таго, што супраць паўстанцаў Беларусі і Літвы царызм кінуў 120 тысяч багнэтаў і

шабель пры належнай колькасці артылерыі. На аднаго паўстанца было пяць салдат. І гэты адзін быў дрэнна ўзброены, а ў пяцёх была вывучка, гарматы.

І, аднак, людзі змагаліся, а Кастусь стварaў сетку арганізацый і атрадаў. Нават у апошнія дні. І гэтыя яго трагічныя апошнія часіны, гэтая тытанічная праца, гэтая мужная ўпэўненасць у тым, што яшчэ не скончана барацьба, гэтая гатоўнасць біцца да канца, гэтая невычэрпная любоў да волі, да радзімы, да дэмакратыі, - робяць асобу Каліноўскага самай трагічнай і велічнай у гісторыі Беларусі, яе нацыянальным героем.

Вось ён, студэнт, люта спрачаецца з "белымі" за волю і зямлю для народа. І мы на яго баку. Вось ён ідзе на чале мужных атрадаў: за поясам чамаркі два пісталеты, на чамарку накінута белая сялянская світка, а побач трапеча баявы сцяг. І мы захапляемся ім. Вось ён сядзіць з пяром над пробнымі водціскамі "Мужыцкай праўды". А мы сочым за ходам яго думак і згаджаемся з імі.

І мы адчуваем фізічны боль, калі ўяўляем яго на эшафоце, з мураўёўскай пятлёй на шыі, калі чуем яго апошнія словы.

Каб ніхто больш не асмельваўся называць рабом простага чалавека і крыўдзіць яго, каб адны не елі "пушны" хлеб, а другія не жэрлі, як не ў сябе, і не подлічалі, каб родная зямля між Дняпром і Бугам (а потым і ўсе землі на свеце) сталі радзімай волі і дэмакратыі, - ён, гэты малады чалавек, змагаўся словам, пяром і зброяй.

Каб не плакалі з голаду дзеці, каб не было прыгону і гвалту, каб квітнела вольнае слова, каб не было няроўнасці, каб не сівелі ў роспачы жанчыны, каб мужчыны не лаяліся бяссільна і не паміралі з думкай, што ў іх жыцці не было жыцця, — ён аддаў сваё жыццё. Бо ведаў: неацэнны дар — жыццё — нельга абражаць рабствам, голадам, цемрай, нацыянальным уціскам, смяротнымі пакараннямі.

"З-пад шыбеніцы" ён напісаў свой славуты верш, звернуты да зямлі, якая нарадзіла яго і выхавала, дала яму песні і родную мову і вочы, што бачылі ўсю нізасць і веліч свету, і сэрца, што беспамылкова адрознівае дабро ад зла.

…Калі яго вялі на пакаранне, ён, як усе "чырвоныя", трымаў кулак левай рукі на тым месцы, дзе білася сэрца. Стары ўмоўны знак змоўшчыкаў.

— Люблю Беларусь!

Грымелі барабаны. І пад гэты пошчак была зроблена адна з самых чорных спраў, якія ведала беларуская гісторыя.

Гэта было 10 сакавіка 1864 года ў дзесяць гадзін трыццаць хвілін раніцы.

З вадой і без вады

Мы ўсе, жыхары нашага дома (вул. Карла Маркса, дом № 36), любім газету "Вячэрні Мінск", выпісваем або купляем яе, верым таму, што там надрукавана.

Любім мы і свой дом, пабудаваны недзе гадоў дваццаць з гакам назад, зручны, цёплы зімою і з халадком летам. Нам добра ў ім жыць і працаваць.

І мы вельмі не любім нешта пісаць і на людзей, і на арганізацыі, і, тым больш, на дом, у якім мы жывём. Хаця гады тры назад мы і пісалі скаргу за шматлікімі подпісамі служачых і пенсіянераў, пісьменнікаў і вучоных, бібліятэкараў і мастакоў, што насяляюць нашу простую, адзначаную мемарыяльнымі дошкамі камяніцу. А пісалі мы пра тое, што ў нашым доме няма вады.

Пісалі. І тое пісьмо было нават надрукавана ў "Вячэрнім Мінску". На кароткі час яно дапамагло, а пасля… што там казаць аб тым, што адбывалася пасля.

Але што рабіць: памалу мы звыкліся са сваім становішчам за дваццаць год (я і мая сям'я — за шэсць). І, магчыма, нават не білі б у званы, каб не рэпартаж з цэнтральнага дыспетчарскага пункта Мінскага водаправода, змешчаны ў газеце "Вячэрні Мінск" 24 сакавіка. Назва рэпартажу — "Як горад напаіць?" Пачатак яго:

"Калі раптам у вашай кватэры перастала цячы з крана вада — не спяшайцеся біць трывогу. Пра гэта ўжо ведаюць тыя, хто адказвае за бесперабойнае забеспячэнне вадой насельніцтва"…

Ужо ведаюць. Гэта суцяшае. Ведае цэнтральны дыспетчарскі пункт упраўлення водаправода вытворчага аб'яднання воднай гаспадаркі "Мінскводаканал". Бо менавіта туды сцякаюцца ўсе звесткі аб стане гарадской сістэмы водазабеспячэння.

"Кожную гадзіну аператары помпавых станцый інфармуюць дзяжурнага інжынера аб ціску, расходзе вады, запасе яе ў рэзервуарах.

…У васьмі пунктах горада ёсць аўтаматычныя датчыкі, якія кантралююць дзейнасць усёй сістэмы. І калі, напрыклад, у нейкім квартале ці раёне горада ціск у водаправодзе не адпавядае ўстаноўленаму, адразу ж прымаюцца меры да аднаўлення патрэбнага рэжыму".

Відаць, наш дом ляжыць далёка ад гэтых васьмі пунктаў. Я зрабіў летапіс забеспячэння вадой нашага дома на працягу амаль двух месяцаў.

25 сакавіка. Усю другую палавіну дня аж да ночы і пазней

краны маўчалі.

26 сакавіка. З дзевяці гадзін раніцы ішла ці толькі гарачая вада, ці адна халодная.

27 сакавіка. Нягледзячы на "нешчаслівы" дзень, панядзелак, вада зрэдку лілася, даўшы магчымасць за дзень дзяжурства наліць (далёка не ўсе) выварκі, вёдры, тазы, чайнікі і ўпрыгожыць імі ванны пакой і кухню. Гэта быў мой абавязак, бо жонка была на рабоце. Мой дзень работы, дзякуючы гэтаму, — прапаў.

28 сакавіка. Вады не было з сямі гадзін раніцы, у дзесяць пацурчала адна халодная, а ў дзесяць трыццаць пайшла і ледзь цёплая.

29 сакавіка. З дваццаці адной гадзіны не было ніякай вады. У дваццаць дзве дзесяць пайшла халодная.

30 сакавіка. У чатырнаццаць гадзін дваццаць мінут гарачая вада некуды прапала. Пасля ёй абрыдла гуляць у хованкі, і ў пятнаццаць пяцьдзесят пацякла, толькі, каб знікнуць у дваццаць гадзін і з'явіцца ў дваццаць дзве….

3 красавіка. Гуллівы настрой не пакідае нашу сістэму. Да 15.30 вада госціць недзе ў іншых месцах. Пяць мінут работы — і "перакур".

16.35–16.45 — ёсць струменьчык. Гэта ж падсачыць трэба. Жыхары сядзяць, як паляўнічыя ў засадзе. З такім самым поспехам. Колькі сапсаваных нерваў… 17.10–17.15 — зноў няма. Нарэшце, вада выходзіць на прагнага "лаўца" толькі ў 23 гадзіны.

5 красавіка. У 15.30 пайшла, каб знікнуць да 18.30.

12 красавіка. Да 17 гадзін гарачай вады не было. Так што гарачай вады ў гэты дзень мінчане скарысталі крыху менш. Прынамсі, у нашым доме.

15 мая. Да 13.50 — суха нібы ў Сахары. У 13.50 выбухамі б'е гразь. Ну, а каб, скажам, чалавек у такі дзень вярнуўся з водпуску? У кватэры нават запасу мінералкі няма. І стала чалавеку, скажам, кепска, а запаслівыя суседзі ў гэты час на рабоце…

Дык вось: "Калі раптам у вашай кватэры перастала цячы вада, не спяшайцеся біць трывогу. Аб гэтым ужо ведаюць тыя…" і г.д.

А сур'ёзна кажучы, да якіх, таварышы, часоў?! Хто там з матэматычным складам мыслення, падлічыце, колькі гадзін за гэтыя амаль два месяцы мы мелі ваду? А за гады? Дык можа плаціць трэба меней? Або наладзіць урэшце водазабеспячэнне?

Ці не досыць? Чэхаў сказаў, што калі зайца біць, ён навучыцца запальваць запалкі. А калі водную гаспадарку?.. Што тады будзе з вадой?

Коласаўцы

Назвы такой да 1944 года не было. І ўсё адно для мяне яны — коласаўцы. Так з вялікай пяшчотай называюць гэтую трупу на маёй роднай Віцебшчыне, і не толькі на ёй.

Колькі я жыву, столькі памятаю гэты тэатр і спадзяюся дажыць вызначаны мне век разам з ім, радуючыся, што ён жыве, нястомна расце, працвітае і, як заўсёды, заваёўвае сэрцы людзей.

Першыя спектаклі БДТ-2 мне давялося бачыць яшчэ да вайны. Тады мы — і я, і тэатр — былі зусім дзеці. Мне год сем. Ён гады на чатыры старэйшы. Бачыць і ў Віцебску, які пасля правінцыяльнай тады Оршы здаваўся вялізным, як Парыж, і ў самой Оршы, у даваенным драўляным тэатры, што так утульна размяшчаўся сярод дрэў парка над рэчкай Аршыцай.

Ясна, што тыя спектаклі моцна падзабыліся, але адчуванне свята ад святла, яркасці фарбаў, музычнасці, нават паху сцэны — яны не забудуцца. І менавіта з гэтай прычыны я не веры ў і не буду верыць у хадзячую тэорыю смерці тэатра, забітага кіно і тэлебачаннем. Не будзе такога, пакуль існуюць дзеці, якія прагна глядзяць на заслону і чакаюць дзіва, якое адкрыецца іхнім вачам, а пасля застаюцца сябрамі гэтага дзіва, гэтага свята — на ўсё жыццё.

Не будзе для мяне асабіста і для тысяч і тысяч іншых, бо на свеце былі і ёсць — коласаўцы.

…Памятаю іх выязныя спектаклі пасля вайны ў выпаленай, ушчэнт спапялёнай Оршы. Калі нават завея не магла выць у руінах, бо і руін не было (немцы разабралі іх на ўмацаванні). Тэатр выступаў тады ў сяк-так адноўленым будынку старога касцёла. І ў нас, падлеткаў, ясна ж, не было грошай, каб паглядзець усе спектаклі. А нам так хацелася гэтай вялізнай штодзённай радасці! Мы проста не маглі без яе жыць. Як без хлеба.

Грэшным чынам, гэта я абследаваў тады хады ў мурах касцёла і дазнаўся, што імі можна прабрацца і на галёрку (былыя хоры), і пад сцэну, і, у горшым выпадку, на гару, адкуль відаць было толькі патыліцы акцёраў.

І мы (хай даруе нам адміністрацыя) кожны раз пранікалі туды і глядзелі, і смяяліся, і аблівалі слязьмі.

Ці мог я тады думаць, што "Званы Віцебска", першая з маіх п'ес, якая ўбачыць святло рампы, убачыць яго менавіта тут, на падмостках тэатра віцебскага, што ёю адкрыецца свята 1000-годдзя горада, што любімыя мае акцёры будуць гаварыць мае

словы, што ў гэтым тэатры я ўрэшце не толькі глядач? А здарылася так. Такое шчасце здарылася. І падзеі трохсотгадовай даўнасці, апісаныя мной, ажылі ў знаёмых мне так даўно мурах, у абліччах так даўно мною любімых.

Мне лёгка і радасна працавалася з імі. І з рэжысёрам, і з мастаком, і з кампазітарам, і з усімі акцёрамі да адзінага. Гэта, згадзіцеся, шчасце. І калі вам будзе так жа добра з усімі намі, з гэтай п'есай, з гэтым цудоўным тэатрам — мы будзем лічыць, што зрабілі ўсё, што маглі.

Гэты тэатр для мяне, як каханне, на якое адказалі ўзаемнасцю. Я дзякую яму.

Мова (што я думаю пра цябе)

Перагарнуў апошнія старонкі кнігі "Што мы думаем пра цябе, беларуская мова?". Кнігі, бо гэты рукапіс — гэта ўжо нешта такое, што адбылося, здзейснілася. Назнарок не кажу нічога пра дзверы папраўкі, якія зрабіў бы ў рукапісу я. Таму што, магчыма, іх зрабіў бы толькі я, і яны аніяк не могуць прэтэндаваць на "ўсеагульнасць".

Таму што цікавасць гэтай кнігі менавіта не ва ўсеагульнасці, а ў шматплыннасці, у мностве твораў жывой, сённяшняй чалавечай думкі. І менавіта ў гэтай цякучасці, сённяшнясці, адлюстраванні становішча, якое маем зараз, цяперашняга пункту гледжання на яго — галоўная каштоўнасць кнігі, складзенай А. А. Бембелем па цаглінцы на фундаменце і пад дахам, якія склаў, стварыў ён.

З самага пачатку згодзімся з аўтарам, які перафразаваў думку М. Глінкі, што "мудрасць стварае народ; філосафы яе толькі аранжыруюць", і з сумнай, на жаль, часта справядлівай заўвагай, што гэтым яны яе почасту "толькі псуюць". З цалкам правільнай заўвагай аб двух узроўнях філасофствавання. Бо гэта праўда, што жывое спасціжэнне ісціны і існага кожнай чалавечай душой, незалежна ад "прафесійнай вывучкі і заняткаў яе носьбіта", заўсёды куды больш жывое, часам куды больш глыбокае і заўсёды куды больш цікавае.

Таму што — магчыма, гэта толькі мая думка, ды я і не прэтэндую на непагрэшнасць, я не папа рымскі — філасофіі нельга навучыць, калі ў аб'екта няма свайго погляду на рэчы, свайго светаадчування, сваіх густаў і — тады ўжо гэта справа зусім безнадзейная — сваіх, непазычаных мазгоў.

А паколькі — па словах Мефістофеля — разумнікаў, як тое быдла:

> Злы дух іх водзіць па стаптанай пашы,
> Хаця навокал свежая атава.

Паколькі кожная былка (чалавек) на гэтым поплаве на сваю асобіцу, паколькі яна — свой, непадобны сусвет, то поплаў (народ) — гэта сукупная непаўторнасць кожнай травіны. І калі чалавецтва — лес, то лес гэты ёсць сукупная непаўторнасць дрэў, а не сукупнасць тэлеграфных слупоў (хаця ніхто і не адмаўляе ім у пэўнай карыснасці).

Што думае кожны чалавек. Ёсць практыка збору рукапісных

архіваў, рукапісных і друкаваных успамінаў розных асоб (каб яны з часам утварылі партрэт эпохі). Чаму не зрабіць практыкай збіранне думак кожнага, з якіх толькі і нараджаецца філасофія эпохі, калі яна жывая, а не мёртванароджаная.

Кніга "Што мы думаем…" — адна з першых (і таму асабліва карысных і патрэбных) спроб паднесці люстру да майго і твайго аблічча. І калі ў кагосьці з нас пыса крывая, то крыўдаваць не трэба, "на зеркало неча пенять". Ды і ўвогуле культурна і па-філасофску выхаваны сучасны чалавек на праўду крыўдаваць не будзе.

Калі Рыгору Скаварадзе (Украіна, XVIII ст.), асветніку, дэмакрату і гуманісту, сказалі, што ён займаецца непатрэбшчынай і размоўнымі гулямі, жадаючы ведаць, што думае кожны чалавек па тым ці іншым пытанні, і што яму трэба гэта канчаць, бо ён пры яго талентах быў бы "стаўпом царквы", сей вандроўны філосаф адказаў з пункту гледжання жывой філасофіі: "Досыць і вас, стаўпоў неабчасаных". А ён ведаў, што такое філасофія абстрактная, меў права сказаць пра сябе: "Свет лавіў мяне, але не спаймаў".

Па-мойму — зноў жа толькі па-мойму — гэта адзіны шлях кожнай навукі: піць ваду не толькі з крана (кніг), не толькі дыстыляваную са шклянкі, але і заўсёды ісці да крыніц, якія б'юць з роднага берага недзе пад тваёй хатай.

Таму што ўсе мы — народ, і філасофія кожнага (і сукупнасць іх) — ёсць філасофія, мудрасць, а значыць, і справа народная.

З самага пачатку скажу, што праца А. А. Бембеля мне спадабалася не таму, што там сказана вуснамі людскімі добрае і пра мяне (адзіна вартая ўзнагарода, хаця, можа, яе і не трэба было, не заслужыў), а проста таму, што яна ўзняла жывое пытанне самога жыцця. Таму што яна не толькі сям-там гаварыла асабіста пра мяне добрае, але сям-там, зноў жа чалавечымі вуснамі, надавала мне асабіста такіх выспяткаў, што я аж дрыжэў ад абурэння і злосці (заслужыў і на тое і на другое). Думаю, што памяркоўныя, разумныя і культурныя людзі паставяцца да яе гэтак жа сама. Бо калі цябе хваліць парсюк, тады прызнайся, што ты і сапраўды "пляшешь" дрэнна. А калі ён цябе лае — гэта значыць, не ўсё яшчэ згублена.

І наадварот.

Таму, паставіўшыся да добрых слоў і да лаянкі талерантна, я спадзяюся, што маю права адразу ж выказаць і сваю думку, і свой погляд на рэчы і іх стан (а значыць, і на праблему кнігі). Гэта не прэтэндуе на глыбакадумнасць, гэта толькі думка, "вандроўнага філосафа і збіральніка філасофіі людской". І таму пастаўцеся да яе цярпіма і бесстаронне, як я паставіўся да вашай.

Вось адна: "Памяраць збірайся, а жыта сей". І незайздросныя доля і слава ў тых, хто ў чаканні "страшнага суда" распрадасць, растрэнькае маёмасць бацькоў і сваю, закіне сваё поле, ляжа ў труну і будзе рыхтавацца, чакаць.

Ганьба яму і пагарда і ў сваім доме і ў чужым. Думаеце, сусед, які сее, будзе паважаць такога? Ды не! Ці яму патрэбен лішні работнік, найміт, на ягоным клапціку поля? Дудкі! Плюне ён толькі і скажа: "Працуй. А наконт страшнага суда, дык гэта яшчэ бабка надвае варажыла ("бабка надвое сказала" або "na dwoje babka wrozyla, albo umrze, albo bedzie zyla" — выбірайце той варыянт, які вам больш даспадобы).

Ну вось, цяпер, выказаўшыся проста, без двухсэнсоўя, я нібы падзяляю з аўтарам ягоны поспех (магчымы) і яго адказнасць. І магу пагаварыць пра кнігу ягоную больш падрабязна. І няхай не надта злуюцца тыя, каго давядзецца зачапіць, а тыя, каго захочацца пахваліць, не так ужо надта скачуць. Па словах вашых мяркуюць пра вас, а вось уздасца вам — па дзеях вашых. А на іх яшчэ трэба будзе паглядзець.

Спачатку думкі тых, чыё слова ўжо канчаткова, на вялікі наш жаль, стала дзеяй і "абскарджанню не падлягае". А.Міцкевіч (ясна, што з яго, як з песні, слова не выкінеш, хаця ён і дарэмна рабіў толькі з нас адных няшчасненькіх, бо ўсе народы і ўсе гісторыі народаў былі гісторыяй прыгнёту і большай ці меншай галечы), Ф. Багушэвіч, Я. Купала, Цётка, Ядвігін Ш., П. Глебка (агульнае ўражанне страшнае: сапраўды мароз па скуры і труба архангела).

І сучаснікі нашы, годныя людзі, якія (будзем спадзявацца і жадаць, каб гэта здарылася праз сто год) некалі таксама з гонарам скончаць свой шлях. Іначай жа нашто жыць?

Пасля Багушэвіча і Купалы і іншых такіх і сапраўды, здаецца, няма чаго казаць. Але гэта толькі здаецца. Занадта яшчэ моцна сядзіць у некаторых учарашні раб, і яму трэба паўтараць вачавіднае тысячу разоў, бо сорам у наш час і нашаму чалавеку хаця ў чымсьці быці добраахвотным рабом… А ёсць і простыя нашчадкі чарнасоценцаў з нейкіх там правінцыйных "лісткоў", якія лічаць, што пасля рэвалюцыі нічога не змянілася, што найлепшы шлях для кар'еры (бо таленту ж і змогі працаваць на службе Айчыне, "не складваючы рук і не шкадуючы сілаў" — няма) — гэта подласць і рэптыльнасць.

І ёсць такія, што, накшталт сына са старой байкі, які спытаў бацьку, як яму "преуспеть в жизни", і, атрымаўшы адказ "служы радзіме", сказаў: "цяжка", а на другую параду: "будзь флюгерам" сказаў:

Ах, нет, я не хочу быть с подлостью знаком.

Ни труд и ни порок меня равно не привлекают.

На што бацька слушна адказаў:

Тогда… тогда будь просто дураком.
Я слышал, многие из них преуспевают.

Усё ж ёсць адзіна годны шлях: служыць айчыне да крывавага поту, не чакаючы ўзнагароды ад людзей і лёсу, проста таму, што іначай нельга. Іначай — сорам. І не апраўданне ганебнаму ўчынку ў тым, што "яны самі так хочуць". Сорам — самім так хацець. І яшчэ большы сорам, спасылаючыся на гэта, на "аб'ектыўную" (хто гэта вызначаў, аб'ектыўна гэта ці не?) хаду падзей, на самой справе падпарадкоўвацца не сваёй думцы, а думцы нейкага дзядзькі. Свой "перапе?с" і праўда ж у сто разоў горшы за іншых.

Так, кніга балючая, кніга непрыемная (а хто хацеў ад літаратуры, ад філасофіі, каб яны "рабілі прыемна"? Мы не ў ложку, мы ў цяжкім рэйдзе, партызаны, дзеці і ўнукі партызанаў). Кніга непрыемная (і ліст "беларуса" з Масквы: раб прыкрывае сваё разумовае халуйства гучнымі словамі), але патрэбная. Як ланцэт лекара.

Бо мае рацыю аўтар, калі кажа пра "бязлітаснае выпрабаванне на жыццяздольнасць". Сорамна не вытрымаць. І ніякі гуманізм (адзіны выпадак!) не апраўданне таму, хто паступіўся свядомасцю, што ён, чалавек, паступіўся сваёй высокай годнасцю чалавечай. Ніякае апраўданне, што гэта "дзеля карысці", "дзеля прагрэсу" — тут… прабачце… ніякае не апраўданне. Як, скажам, Каліноўскі, Сусанін, Альгіяці, Міхал Крычаўскі ад болю заплакалі б і выдалі, скажам, маці, бацьку, брата, таварыша. Прычым тады, калі перастала балець.

"Лёс не толькі беларускай, але і ўсіх іншых нацыянальных культур і моў вырашаецца тут, на Беларусі".

Правільна. І кепска, калі мы, гераічны народ (успомніце кожнага чацвёртага!), падамо ўсім кепскі прыклад. Самых слабых. Самых горшых.

Я не хачу належаць да ніводнага тыпу, акрэсленага на адной са старонак. Ні да "балота", ні да "эміграцыі", вонкавай ці ўнутранай. Не хачу і жыць у чужым выгодным сутарэнні, працаваць у сухой чужой шахце. Я хачу разам са сваімі шматлікімі братамі сумленна працаваць у шахце сваёй, ставіць падпоры са сваёй сасны, каб яны (і я) даўжэй жылі і працавалі. Без гэтага жыцця не мыслю, а калі давядзецца (немінуча!) адыходзіць з яго, то я хачу, каб труну мне зрабілі з роднай сасны. Я быў, думаецца,

някепскім гарняком-крапільшчыкам і, думаю, заслужыў на гэта.

А наконт таго, ці шмат здолее адзін (с.34), — тут не. Нават адзін здолее, калі да канца. І тут трэба выкарыстаць сябе як мага разумней. Бо і сапраўды, нашто мне інтэгрыравацца. Калі ўжо глабальная інтэграцыя, то інтэграцыя ўсіх (а й нудны жа ж будзе гэты свет, калі ўсе інтэгрыруюцца). Ты мужчына, таму аддай каму хочаш (людзям, лёсу, радзіме, жанчыне) душу, жыццё, сэрца. Але хоць гонар свой пакінь сабе. Не дазваляй нікому трымаць цябе за вусы, хай нават рэдкія. І нават калі здарыцца няшчаснаю воляю лёсу горшае — трэба быць не Неронам і не Мамурай латыні, а яе славай.

Быць Катулам, Гусоўскім, Капернікам (да іх, хочаш не хочаш, звяртаюцца і зараз), але прайграй са сваёй латынню мужна. А лепей не дапускай да гэтага, нізавошта, бо "мёртвыя сораму не імуць".

…А ён рацыяналістычны, гэты "філосаф каля сарака". Аж агіда бярэ, такі разумны. Толькі розум не пакінуў там месца для душы, для гонару за сваё "я". Кажа пра дружалюб'е палітыкана і дзеяча духоўнай культуры. Прабачце, нешта не чуў. Бо не школа знішчае мову і не універсітэт, а тое, што мы з іх зрабілі. Мы, адзінкі, надзеленыя духоўнай уладай і… рэптыльнасцю. Праўда, лягчэй за ўсё абвінавачваць бюро прапаганды Саюза пісьменнікаў (пісьменнікаў там: якраз, кот наплакаў).

А вось "мастацтвазнаўца" (с.43) — малайчына. Сапраўды, калі чалавецтва ідзе да спрошчанасці казарменнай — тады адна мова, калі да складанасці — мноства.

І "гісторык філасофіі" мае рацыю. Паказваючы карані хамства і іхні працяг-чартапалох… А што мы, беларусы, зрабілі ў літаратуры не "жалкую пародыю" — гэта зараз ужо і сляпому ясна.

І, галоўнае, у большасці выказванняў сапраўдная гаспадарчая заклапочанасць шляхамі мовы, культуры, бацькаўшчыны (лепшае, што даў новы час новаму чалавеку і што мы не павінны згубіць). А за кожным выказваннем тых, хто "развенчвае" выпакутаваныя бацькамі каштоўнасці, - проста аж свеціцца духоўная (не хачу сказаць "разумовая") абмежаванасць. Заўтрашні "пажарнік", які ў Рэя Брэдберы ("451? па Фарэнгейту") пры спрыяльных абставінах паліць кнігі.

І як прыемна нават паспрачацца, нават не згадзіцца з "мастацтвазнаўцам, каля 30 гадоў", з чалавекам, які ўмее разважаць. Вядома, пакуль мы яшчэ сіла. І — сумная рацыя пра дзіцячыя садкі і іншае. Але таварыш памыляецца ў думцы, што беларусам "навязалі" паняцце аб нашай мове як "непрыгожай".

Не, яна і сапраўды непрыгожая… ад дрэннага ведання яе. Існуе няпісаны (і неабвержны) закон, які цудоўна ведаюць усе па-

сапраўднаму адукаваныя і культурныя людзі: чым лепей ведаеш нейкую мову (і гэта можна сказаць не толькі пра мову, але і пра краіну, навуку, сяброў, многіх жанчын, мастацтва і г.д.) — тым больш яна прыгожая і значная. Польская шыпіць? Нямецкая брэша і гаўкае? Брахня! Якія яны мілагучныя… для тых, хто зведаў (і, вядома, калі вусны кажуць "Der Freund" (друг), а не "erschie?en" (расстраляць); думаю, што апошняе слова і па-італьянску прагучыць для аб'екта гэтага дзеяння не вельмі прывабна).

Чым болей паглыбляешся ў кожную мову, чым лепей разумееш адвечную логіку яе законаў — тым яна большы ўзор прыгажосці і дасканаласці. Лаяць нейкую мову — азначае не ведаць яе. Ды яшчэ з самаўпэўненасцю, уласцівай непісьменнай тупасці, ганарыцца, што ты — цёмная бутэлька.

Лаяць, праўда, і на іншым, вышэйшым узроўні. Не так, як лае жанчын той, хто ніколі іх не ведаў, а як чалавек, які многа і шчасліва кахаў, часам пакеплівае з сапраўды каханай жанчыны, нават калі яна не Афрадыта, але дарогі табе ад яе — няма.

Байран назваў сваю, англійскую, мову грубай і дзікай, сказаў, што яна звыкнула "свісцець, шыпець, плявацца". Але той жа Байран, напэўна, за прапанову здрадзіць ёй разбіў бы жартаўніку зубы (тым болей што быў першакласны кулачны баец). Ды яму, ведаючы гэта, ніхто і не пасмеліўся прапанаваць такое.

Прынцып такіх людзей: "Я пан жартаваць сам з сябе. Але як нехта іншы паспрабуе нахабна пажартаваць — я здолею яго абарваць у адно імгненне".

Па-мойму, гэта першы прынцып сапраўдных мужчын (з жанчын не жартуюць). І калі нехта яго не прытрымліваецца — што ж, значыцца, у яго няма ніякіх прынцыпаў… Ёсць беспрынцыповасць, узведзеная ў прынцып.

І іншыя галасы. Устрывожаны, мастака 32-х год, аб тым, што немаўля толькі праз мову звязваецца са светам, што выклікае трывогу стан, калі з дзіцячага садзіка прыходзіць маленькі вораг нацыянальнай культуры, адбываецца генетычная падмена і, у выніку, з'яўляецца духоўна хворы чалавек, што актуальнай становіцца тэма духоўнага жабрацтва.

Рабочага, які думае па-дзяржаўнаму, як акадэмік. І лепей за некаторых акадэмікаў (с.64–65). Настаўніка з Мядзельшчыны, які цалкам правільна сказаў аб голых прагматыках ("не трэба мовы, бо няма з яе выгады"), якія забываюць, што мова — душа народа, і тут шукаць выгады — гэта блюзнерства над самым запаветным. І голас рускай, сацыёлага, з якога відаць, што гэта хаця і трошкі сухаваты, але homo sapiens. Або філосаф-эстэт (с.119), па думках якога адразу відаць, што не трэба было яго вучыць філасофіі, бо й так разумны. Хіба што вучоба прыдала ягонаму прыроджанаму

розуму лоск і тонкасць у выслоўліванні (справа другарадная) і спрыт у аперыраванні вучонымі тэрмінамі (што і ўвогуле справа дзесятая). І вось што цікава ў адносінах да такога тыпу людзей. Ледзь чалавек выяўляе памяркоўнасць, жаданне зразумець, павагу да суседскага — адразу мешчанота пхае яго ў нацыяналісты (бо зручна, хутка і, у разумовым сэнсе, дзёшава і танна). Яго, рускага, — у беларускія нацыяналісты. Мяне калісьці (а быў 1950 год) — у нацыяналісты ўкраінскія.

Каб ганілі, атрымоўваецца, нічога б не было, нават добра было б.

Нявызнаныя шляхі твае, пане Божа!

Што ж, я нацыяналіст. Украінскі (як мала хто з украінцаў ведаю Т. Шаўчэнку), польскі (Норвід і Міцкевіч — браты мае), нямецкі (за Рыльке), рускі (за ўсіх, ад Кантэміра да Паўстоўскага і Шукшына), іспанскі (за Рысаля, Вальеха і Лорку). "Усіхні" нацыяналіст і ганаруся гэтым ярлыком.

І шавініст. Па той прычыне, што жылі ў гэтым лепшым са светаў і рабілі яго далёка не лепшым, розенбергі і гімлеры, мураўёвы і ўласавы і іншыя, няма ім ліку. І калі нехта падумае навесіць мне і гэта — буду ганарыцца і такім.

Разумею, што прынцып ананімнасці можа згуляць са мною кепскі жарцік. Сярод тых, каго хвалю, могуць апынуцца асабістыя мае ворагі (значыць, абставіны не дазволілі нам зведаць цану адно аднаму), а сярод тых, каго лаю, — сябры (значыць, прыкідваліся са мною або ненарокам, пад настрой, ляпнулі нечуваную дурасць). Але я тут хвалю не іх, а правільную думку, лаю не іх, а думку, ад якой на хвіліну не хочацца належаць да чалавечай грамады. І я раблю гэта не ананімна, так што хай ведаюць.

І таму скажыце гэтаму "беларусу", сацыёлагу трыццаці год" (с.109), што "эліта" можа і зарабляе на беларускай мове грошы, а "не эліта" — почасту сінякі і інфаркт. "Сацыёлаг" проста знаходзіцца ў палоне мяшчанскіх уяўленняў аб тым, што паэты купаюцца ў грошах і з гэтай прычыны, на жаль, у палоне зноў-такі мяшчанскай зайздрасці і нянавісці да іх (пачуцці, якія не прыкрашаюць чалавека).

Брыдка гэта рабіць (чаму сацыёлаг павінен атрымоўваць грошы за сваю працу, а паэт — не?), але даводзіцца. Я не ведаю, дзе працуе гэты чалавек. Але, скажам, ён працуе ў АН БССР. Калі ён малодшы навуковы супрацоўнік без вучонай ступені, то ён атрымоўвае ад 140 да 165 рублёў у залежнасці ад стажу работы і іншых прычын. Калі ён кандыдат, то пасля пяці год працы — 150 рублёў, а пасля дзесяці — 175 рублёў. Калі ён кандыдат і старэйшы навуковы супрацоўнік, то адпаведна 210-230-250

рублёў (у адрозненне ад "сацыёлага", ніколі не лічыў чужых грошай і спраўкі пра іхнюю зарплату навёў пяць хвілін назад). У іншых інстытутах, у Кіеве, у Маскве могуць быць пэўныя разбежнасці, але мы бяром першы — лепшы выпадак.

Цяпер уявім сабе, што малады паэт (а па нашых разуменнях ён малады, бо напісаў ніжэйпамянёны верш, калі яму было дваццаць тры гады — дваццаць чатыры павінна было стукнуць праз два тыдні) А. С. Пушкін прынёс у рэдакцыю часопіса "Нёман" свой верш "Птичка".

В чужбине свято наблюдаю
Родной обычай старины:
На волю птичку выпускаю
При светлом празднике весны.
Я стал доступен утешенью;
За что на Бога мне роптать,
Когда хоть одному творенью
Я мог свободу даровать!

Рускі верш, і таму рускі паэт прынёс яго ў рускі часопіс. Але каб быў беларус і прынёс у беларускі — справа не змянілася б, стаўкі тыя самыя.

Рэдактар "Нёмана" А. П. Кудравец чалавек разумны і зразумеў, што перад ім — Пушкін (а нехта мог бы і не зразумець), і таму вырашыў надрукаваць "Птичку" і аплаціць яе па стаўцы ганарару для маладых, рубель дваццаць капеек за радок. Шчаслівы паэт пастаяў ля ганарарнай касы і, купаючыся ў золаце (9 р. 60 капеек мінус падаходны падатак і падатак за бяздзетнасць), пайшоў — гуляем, брат! — у "Юбілейны" (па думцы некаторых, нашы паэты адтуль не вылазяць).

Але, скажам, Пушкін у свае дваццаць тры ўжо лаўрэат і атрымоўвае па вышэйшай у перыёдыцы стаўцы, два рублі за радок. Тады ён выйдзе з шаснаццаццю рублямі ў кішэні. У кнізе лаўрэат Пушкін атрымаў бы за той самы верш дваццаць чатыры рублі, і больш няма, самая вышэйшая стаўка. Ну, але ж не адзін верш за год ён напіша?

Падлічым і тут. Кніг у гэтым годзе, наколькі мне вядома, ён не выдаваў, паэм — не пісаў. Не напісалася ("Каўказскі палоннік" — 1822 г., "Бахчысарайскі фантан" — 1824, "Цыганы" — толькі напісана ў 1824 годзе, "Браты разбойнікі" — 1825 год).

Колькі ж ён зарабіў? Напісана адзінаццаць вершаў. "Птичка", "***Кто, волны, вас остановил", "Ночь ("Мой голос для тебя и ласковый и томный"), "***Завидую тебе, питомец моря смелый" (бачыце, "питомцу" ён зайздросціць, а не яго ганарару),

"***Надеждой сладостной младенчески дыша", "Демон", "***Простишь ли мне ревнивые мечты", "***Свободы сеятель пустынный", "Кн. М. А. Голицыной" (верш відавочна альбомны, а не для друку), "Телега жизни", "Жалоба".

Нават калі б усе яны былі надрукаваныя — сто шэсцьдзесят восем радкоў. Як на маладога — і без кнігі — 207 р. 60 к. Як на лаўрэата і ў кнізе — пяцьсот чатыры рублі. За год!

Зайздросціць і кідацца гноем "сацыёлагу" відавочна няма чаго, па-руску ці па-беларуску піша паэт. Ён спытае": "А чаму вершаў толькі адзінаццаць? Чаму не трыста адзінаццаць?" Адказваем": "Можна, мабыць, кожны дзень пісаць артыкул у газету, нават сацыялагічны, але нельга кожны дзень "выдаваць на гара?" "Свободы сеятель пустыннай". Дый артыкул, калі гэта не смецце, так не пішацца".

"А чаму б яму не пайсці на радыё, у газету, на тэлебачанне, у кіно?"

А ты пайдзі. Зрабі. Пражыві з таго, што заробіш пяром. Большасць паэтаў, да ведама "сацыёлага" (кепскі ён, відаць, сацыёлаг, калі не ведае, колькі плацяць за радок і колькі каштуюць боты), ходзіць "у дэпартамент". А хто не ходзіць (адзінкі), зарабіў гэта права шматгадовым крывавым потам.

Можа, і ёсць такія, што "купаюцца ў золаце", што "мільянеры", але я асабіста з такімі не знаёмы. Грошай дарэмна ў нас (і нідзе) за працу не даюць, на якой бы мове ты ні пісаў. А ў "злодзеі ад літаратуры" (мабыць, ёсць і такія, як ёсць і "злодзеі ад сацыялогіі") пісаць працаўнікоў несумленна і брудна, селянін ён або паэт. А параўнаюць зарплату сярэдняга сацыёлага з ганарарам сярэдняга паэта (не тых, што пішуць левай нагой таўшчэзныя даследаванні і пульхныя паэмы, ад якіх мухі дохнуць) — стараннія непрадузятыя людзі.

Не ведаю, ці піша "дзеля заробку" "сацыёлаг" (гледзячы на тое, як ён лічыць капейкі ў чужой кішэні — піша), але большасць паэтаў піша не дзеля рубля, а дзеля самавыказвання, таму што іначай не могуць. І самавыказваюцца па-беларуску, таму што на іншай мове яны, вядома, мелі б большую колькасць чытачоў, але не маглі б выказацца так глыбока, з поўнай аддачай, як на сваёй.

Або гэты, "беларус, журналіст паміж 40 і 50 гадамі" — гэта той самы аўтар "ліста з Масквы", толькі, здаецца нам, крыху больш разумны, бо можа затуманіць у галаве чытача або субяседніка просты сэнс складанымі (таму і здаюцца разумнымі) словамі.

Пра аўтара "ліста" ("Интересный человек пишет") можа так сказаць толькі ягоны духоўны сабрат, чалавек у сутнасці глыбока нецікавы і "р-рэалістычны". Чалавек, які сам мысліць не хоча (а мо

не можа).

Ведаем мы, за якім папугаем паўтарае ён словы, калі гаворыць пра "беларускі патрыятызм, прынесены немцамі або палякамі". Вось кніга А. Рыціха "Обиженный край" (Пб, 1911). Я не думаў, што мне давядзецца звяртацца да яе другі раз (у першы раз я ўзяў з яе кавалкі, каб паказаць духоўнага бацьку гэтага чарнасоценца, прафесара Руніна, якому ў "Каласах" Алесь уладкаваў абструкцыю), але, відаць, руніны і рыціхі жывуць і не шманаюць. Цытую:

"Русский коспомополитизм, марксизм, незнание России и ее народа… взяли верх над государственной и национальной идеею. Общество не хочет и не может понять, что Россия может жить только с таким духом народа, как было при Царях Иоанне III и Алексее Михайловиче…" Необходимо попечение, "иначе он (край. — У.К.) легко может сделаться достоянием немцев, даже австрийцев и, чего доброго, поляков…". Жиды-шпионы "по шоссе от австрийской границы к Киеву и от Кенигсберга к Риге и Петербургу — по пути вражеской армии… всё на пользу вторгнувшегося войска…". А вось пра беларусаў: "Пинчук, этот обитатель Пинских болот, с личностью, не похожею на человека, с ногами в виде колеса и непонятным говором, исчезает окончательно" (сказаў бы ён такое паляшучкам Жэні Янішчыц і Веры Палтаран або спевакам з Клетнага і Тонежа). А вось пра ўкраінцаў: "К особенностям Юго-Западного края следует отнести появление там с 60-х гг. XIX ст. украинофильства, сильно теперь подогреваемого австрийскими агентами. Это дело с обществом Шевченки во главе (?), какою-то оперою Наталки-Полтавки (?) и ограниченным числом фантазеров, полагающих, что Малороссия, малороссы, составляет что-то особенное со своим неразработанным наречием и своими чумаками…" "Как у немцев Германия превыше всего (ад каго мы гэта яшчэ нядаўна чулі?), так у нас наш русский Государь превыше всего… Не пора ли бы напротив того войти в соглашение с Германией и окончательно присоединить к себе русскую Галицию по Сан: Знай, ляше…"

Не сорамна, марксіст (а пэўна ж!) сацыёлаг NN.

Але, можа, гэта адзін дурань Рыціх знайшоўся? Ды не, вось рускі гістарычны белетрыст XIX ст. растлумачвае пугачоўшчыну (!)"польской интригой". Вось сучасны культурны дзеяч піша пра Радзівілаў, "говорящих по-польски с берлинским акцентом" (а княгіня Ізабела Радзівілова жыве сабе ў Варшаве, узнагароджаная за падполле ордэнам "Віртуці мілітары", па-нашаму Герой Савецкага Саюза).

Дзіўна неяк дажыць да год "паміж 40 і 50-ю" і не нажыць ні сумлення, ні розуму. Ды ўрэшце застацца проста элементарна

непісьменным. Філіповіч — "адзіны беларускі мастак"?

Словам, заклікае да сур'ёзнага падыходу да справы, а сам несур'ёзны, чужых вяршкоў нахапаўся, нічога не ведае пра культуру народа, да якога належыць па пашпарце і сярод якога жыве.

А, як вынік гэтага неразумны і, як кожны такі, небяспечны.

Бо працуе на карысць ворагаў нашага мыслення. Ім дае козыры ў рукі, а братам і таварышам робіць мядзведжую паслугу.

И как отдыхает душа, когда после этого "белоруса" слушаешь русского, учителя (с.155), которому хочется, "потеряв на минутку тайну своей души, вселенскую тайну", ответить на его языке (как ответил бы и на любом другом). Ибо он мне больше брат, чем вышеуказанный "белорус". Я бы сказал: "прожжённый белорус".

І якія розныя людзі (с.157)! Якія непадобныя! З памылкамі і з азарэннямі! Як з імі цікава! Не тое што з некаторымі "падкутымі", якія лічаць, што таму маюць права брыкацца і (с.158) менавіта "адштурхоўваюць частку народнай інтэлігенцыі і даюць зброю ворагу".

Во глядзіце, куды ўсё ж ідуць самыя таленавітыя? Да сваёй культуры і мовы — часцей за ўсё. Да суседняй — радзей (і Твардоўскія сярод іх шчаслівае выключэнне). А збольшага, калі адрываецца ад свайго, — прыстасаванец (не хачу сказаць "рэптылія") накшталт вышэйпамянёнага культурнага журналіста.

Аўтар мае рацыю (с.128). Найбольшая "культурная каштоўнасць" — мова. То вось і зберагайце яе ("Канстытуцыя БССР", Мн., 1978, с.22). І тут погляд аўтара ледзь не адзіна правільны.

Ёсць і трохі недадуманае. "Творчую радзіму" чалавек не выбірае. Яна выбірае яго, калі ён разумны і ўмее прыслухацца да сябе. Не толькі Ян Баршчэўскі, але ўспомнім "гімназічна-альбомныя" вершы М. Багдановіча па-руску (а ён жа "вучыўся Беларусі" па кнігах, а "вучыўся Расіі" ўсімі абставінамі жыцця). Яшчэ пацверджанне — Пушкін. Французскія вершы ягоныя (хаця ён сам прызнаваўся, што пісаць па-руску яму было "ўсё ж такі цяжка") не ідуць па якасці ні ў якое параўнанне з яго рускімі вершамі (тое самае і ў Шаўчэнкі). Так што выбірай, нават калі ты часталюбівы (а з такіх пераважна і выходзяць "асвечаныя касмапаліты"): быць пасрэднасцю на мове суседа або нечым значным на сваёй. А "значны" гэта азначае "значны для многіх", калі б нават на тваёй мове гаварылі сто чалавек.

Выключэнняў я амаль не ведаю (Шамісо? Конрад? Яшчэ пару чалавек — вось, бадай, і ўсё). Калі, вядома, не лічыць "ірландцаў па крыві" — ад Свіфта да Уайльда і Шоў. Але там была традыцыя, корані якой у сярэдневякоўі. І, дарэчы, "ірландцаў і шатландцаў"

(Маршаку жартам прапанавалі перакласці Бёрнса "назад на англійскую", каб англічане маглі разумець, але забыліся, што (можа) без "шатландскай гаворкі" Бёрнс не быў бы цікавы ні англічанам, ні рускім, нікому) нашаму брату бывае чытаць почасту цікавей, чым некаторых "чыстапародных" англічан.

Ох, як трэба быці ўважлівым да кожнага слова. Нават да "подпісу ў мастака" (с.153). Вось вялікі рамантызм літоўска-беларускага памежжа ў Чурлёніса. І раптам, у хвіліну слабасці (іначай не назавеш, бо самыя складаныя паняцці такі мастак, як Чурлёніс, мог перадаць праз фарбы і лініі, а тут вырашыў "абысціся танна", падмацаваць словам — а мастакі твораць рукой і душою, а ніяк не словам; гэта за іх, часта няўдала, робяць крытыкі), перадае на палатне (!) словы Бога (!) у момант стварэння сусвету (!): "Stan sie!"

Бог (а бацька мастака — касцёльны арганіст) самыя важлівыя свае словы (дзеля якіх яго і шануюць) сказаў на мове пераважнай большасці тых, што адпачывалі тады ў модных Друскеніках. Ну а на якой мове сказаў бы ён гэта зараз? Хто пераважае там зараз?

Не-е, тут нешта не тое. Бога ў гэтыя справы ўблытваць не варта. Але свае чалавечыя адносіны да створанага табою свету — можаш і павінны.

…Гучаць і гучаць дзесяткі розных, непадобных, часам супярэчлівых галасоў.

Паэтава супярэчлівасць (с.204). Па-руску ёсць і іншае адценне сэнсу: "противо-речь-е". І адна "рэч" супярэчыць другой, а адна "речь" — іншая.

З нямых радкоў
я узыду.

Мы верым гэтаму. Але, пакуль тое, "нямыя радкі" выказваюцца… па-беларуску.

У кнізе маса глыбокіх і цікавых думак. Цікавых, бо новых і ўпершыню ў такім аб'ёме сабраных у адно. Думак, якія карысна ведаць і дзеячу вытворчаці, і дзеячу культуры, і дзяржаўнаму дзеячу. І за кожнай думкай жывая душа, і многім такім душам спачуваеш. Бо гэта каструбаватая, з усіх бакоў узятая, голая праўда, падабаецца яна мне ці не.

Так думаюць людзі. А гэта заўсёды трэба ведаць.

Вось скардзіцца дзяўчына семнаццаці год. Ёй здаецца, што яна ў пытанні, якое ўздымае кніга, няшчасная. Дурненькая, сотні людзей пачыналі пазней за цябе. Той самы Купала. Ты яшчэ сто разоў можаш зрабіцца шчаслівай. Ніколі не позна.

…Настаўнікаў такіх сапраўды (с.40) ад школы, ад дзіцячай

душы паганай мятлою трэба гнаць. Продкі мелі рацыю: "Здраду прымаюць, а здрадніка вешаюць". Як не прыняць, калі на тваю карысць? Але здрадзіў ён іншым — жорстка здрадзіць і табе. Абапірайся на цвёрдых, сумленных, хай непакорліва-самастойных, але непадкупных.

Прыехаўшы ў суседнюю краіну, я стараюся гаварыць на яе мове. Калі дужа захачу — бывае, што й досыць паспяхова. Бо не хадзі са сваім статутам у чужы манастыр. Хай кепска, але старайся гаварыць на мове гаспадара, тады ён цябе паважаць будзе: "Добры чалавек, стараецца хоць слова па-нашаму сказаць. Пэўна, і сваю мову паважае, пэўна, яна — вартая таго".

Мае рацыю настаўнік з Мядзельшчыны: "Людзі, якія забыліся сваё мінулае, сваю культуру, сваю мову, ператвараюцца ў табун, які жадае толькі аднаго — набіць бруха або кішэню". На жаль, праўда. І, на жаль, гэтая чарада сям-там расце. А верыць такім нельга. І паважаць няма за што. А наконт "у раи воздастся" — чулі мы гэтыя байкі пра райскую канюшыну.

Або вось жанчына "са сферы сервісу": "Калі мільёны адмаўляюцца — што ж тут адзінкі зробяць?" Псіхалогія адчаю і духоўнай ніцасці. Ну а каб А. С. Грыбаедаў не пытаў:

> Воскреснем ли когда от чужевластья мод?
> Чтоб умный, добрый наш народ
> Хотя по языку нас не считал за немцев.

Каб уся інтэлігенцыя не спытала так — дзе была б Расія? Каб Месроп Маштоц тысячу пяцьсот год таму не прыдумаў алфавіта — дзе была б Арменія? Каб адзінкі з "блакітнай ружы" не гінулі — дзе быў бы гонар гётэўскай Германіі?

Адзінка толькі тады "нічога не можа", калі яна — амёба (ды й тое можа; скажам, можа, каб горад вымер ад дызентэрыі, калі ты амёба — носьбіт гэтай заразы). Або проста носьбіт рэптыльнай баязлівасці.

Ёсць там у кнізе адзін такі "вучоны за семдзесят год". Хаця — ну чаго табе баяцца? Табе за семдзесят, і нават калі б, крый Божа, нейкі звар'яваны гітлер здолеў бы на нейкую гадзіну захапіць уладу ў тваім доме — што ўжо асабіста табе? Хаця? Калі за семдзесят год не здолеў зрабіць нічога добрага і годнага, тады, мабыць, і хочацца зберагчы жалю вартыя рэшткі мала каму, акрамя цябе, патрэбнага жыцця. Бо пры жыцці хоць сусед ці пляменнік помняць (грошай пазычыць), а хто ўспомніць пасля смерці? І вось гэты "за семдзесят" б'е ў пастронкі і закачвае ад невытлумачальнага жаху вочы:

"Я не хочу к этой проблеме иметь никакого отношения!.. Я не

хочу быть к этому делу причастен ни в коей мере".

"Сколько, например, общих слов в белорусском и русском языках — это проблема".

"Считайте, что я ничего не читал и что мы с вами ни о чем не говорили… Кому передать ваши "материалы"?"

Я ведаю, што гэтым "падпісаным" артыкулам прыдбаю сабе шмат "ананімных", невядомых мне ворагаў. Нічога, суцяшае тое, што я прыдбаю ім яшчэ болей невядомых мне сяброў. Часам, вядома, шкада, што з табою гавораць ананімы. А вось у вышэйпамянёным выпадку — не. Каб сам так думаў, то "ананімовасць" была б дабротай Божай. Як і шчыт "антымарксізм", якім часцей за ўсё прыкрываюцца якраз бесхрыбетныя, то-бок той матэрыял, з якога марксіста не збудуеш.

Шчыт мяшчанства, якое нічога не ведае і, галоўнае, нічога не хоча ведаць. І, сапраўды, вось такія "вырашаюць": "быць ці не быць" беларускай мове?

Думайце пра свае бранзалеты, а мову пакіньце ў спакоі. Ёй, з гэтай прычыны, нават лепей будзе.

Вось толькі вашы дзеці? Але вы іх і так сапсулі прагнасцю і філасофіяй "хлебаеда". Дык псуйце ўжо да канца, калі не знойдзецца на іхняй дарозе добрых і мудрых людзей. А яны, хочацца думаць, знойдуцца.

Горкая праўда, вядома (с.79), што ёсць "радетели", якія часам "радеют на публике". Ну, а ты, прапагандыст "каля 50 гадоў", за што "радеешь" ты? "Беларус", а нянавісць да крывадушнікаў распаўсюджваеш на мову маці сваёй. Як той унцер, які, вярнуўшыся з арміі на вёску, ішоў паўз матчыну хату і на заклік: "Сыночак, дык, можа, зайшоў бы" — адказаў:

— А чьёрт вас знает, игде вы тут живьёте.

Затое ўжо як сустрэнеш чалавека (с.61–72), дык гэта чалавек. І не таму, што сям-там прыхільна кажа пра маю асобу. Гэта справа дзесятая. А проста відаць чалавека, які шмат адчуваў, шмат думаў і думае і шмат пакутаваў. Нават каб не гісторыя з яе маленькім, ад якой у мяне аж усё сціснула.

Можа, вось ёй бы не ў гідрабіёлагі, а ў пісьменнікі. Мала, праўда, сапраўдных пісьменнікаў жанчын. Не іхняя гэта справа. Іхняя справа жыць, быць шчаслівымі. Але як шмат цярпела, то тады з яе атрымоўваецца, як І.Франко пра Лесю Украінку сказаў: "Адзіны мужчына на ўсю навачасную саборную Украіну".

І менавіта не з той яна інтэлігенцыі, пра якую так правільна сказала.

І, як завяршэнне, два фрагменты.

Студэнтка 21 года: …Лёс мовы?..

Будзе не так, як гісторыя захоча…
Будзе так, як мы зробім!..

І радкі Пімена Панчанкі:

…пакуль сонца не згасне,
Пакуль свецяцца зоры,
Беларусь не загіне, будзе жыць Беларусь!..

А пад імі дата "1941".

Калі тады так думалі, то цяпер іначай думаць — Сорам!

Ці, можа, мы можам думаць па-сапраўднаму толькі тады, калі нам залюць гарачага сала за скуру?

Не, з усёй адказнасцю думаю і кажу, што не.

І маю права на гэта.

Таму што сам вярнуўся да сваёй мовы. Ведаючы і іншыя, як сваю (некаторыя, можа, на самым пачатку, нават у нечым лепей), аднойчы зразумеў, што сапраўды свая сярод іх толькі адна.

Як я распарадзіўся гэтым разуменнем — хай судзяць людзі.

Наш агульны клопат

У рэспубліцы ствараецца музей народнай архітэктуры і быту

У канцы мінулага года Савет Міністраў БССР прыняў пастанову "Аб стварэнні Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і быту". Рашэнне гэта — адно з красамоўных сведчанняў клопатаў нашай партыі і ўрада аб далейшым развіцці беларускай нацыянальнай культуры.

Што будзе ўяўляць сабой будучы музей, музей пад адкрытым небам? З усёй тэрыторыі рэспублікі мяркуецца звезці і паставіць у адным месцы, у маляўнічай мясцовасці пад Мінскам, найбольш старыя і найбольш тыповыя сялянскія і местачковыя пабудовы: хаты, пуні, гумны, адрыны, дрывотні, млыны, іншыя жыллёвыя і гаспадарчыя пабудовы.

Вырасце як бы вялікае паселішча, і наведвальнікі яго здолеюць за досыць кароткі час убачыць, як жылі сяляне і местачкоўцы розных этнаграфічных раёнаў Беларусі трыста, дзвесце, сто гадоў назад, учора.

Дзеля чаго гэта трэба? Ну, перш за ўсё, — гэта гісторыя народа. І праз гісторыю музей павінен яшчэ больш умацаваць у нашых людзях, і ў першую чаргу ў моладзі, пачуццё патрыятызму (а значыць, і інтэрнацыяналізму), пачуццё высокай адказнасці за сваю Радзіму, пачуццё павагі да працоўнага чалавека і кроўнай роднасці з ім.

І яшчэ: музей пад адкрытым небам — гэта Веданне. Веданне матэрыяльнай і духоўнай гісторыі народа.

Якой наша краіна стала за гады Савецкай улады — гэта ўсе мы добра ведаем (відавочныя таму прыклады будуць трапляцца ўжо на кожным кроку па дарозе з Мінска да музея). А вось якой была наша краіна, якой была яе культура да рэвалюцыі, з чаго мы выраслі — уяўленне аб гэтым і павінен будзе даць музей народнай архітэктуры і быту.

Міністэрствам культуры БССР зараз ствараецца арганізацыйная група. Яна будзе працаваць пакуль што пры міністэрстве, але як самастойная адзінка. Разам з зацікаўленымі арганізацыямі гэта група зоймецца зборам экспанатаў, выяўленнем і адборам помнікаў народнага дойлідства, грамадскіх і бытавых пабудоў, збіраннем даўніх прылад земляробства, рамяства, побыту, а таксама твораў народнага мастацтва.

Арганізацыйная група — будучая дырэкцыя — мае намер

абапірацца на шырокае кола грамадскасці. І не толькі на дапамогу членаў таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры (хаця, вядома, гэта ў першую чаргу іхняя справа, справа іхняга гонару), але і на актыўную дапамогу ўсяго насельніцтва рэспублікі.

Распачынаецца справа вялікай важнасці, і справа гэта можа быць даведзена да поспеху толькі пры актыўнай дапамозе кожнага з нас. Таму што мы з вамі, і толькі мы, ведаем, як выглядаў "бегунок", на якім мы вучыліся хадзіць, пакуль маці пякла аладкі, як выглядаў "ключ" (ад старажытнага слова "клюка"), якім хітра адсоўваўся "рыгель" у дзвярах.

…Уявіце сабе вялізнае вадасховішча, хваёвы і лісцёвы лес на яго берагах, а ў гэтым лесе, на ўзлессі і палянах, звезеныя з усіх канцоў Беларусі будынкі. Срэбна-шчапяныя дахі і залаціста-саламяныя стрэхі. Разьблёныя ліштвы і франтоны. Махаюць крыламі ветракі, шуміць вадзяны млын. У лесе — леснічоўка. На беразе — рыбакова хата. Над вяндлярнямі — ядлоўцавы дымок. Тут — тыповы сялянскі двор з Полаччыны ці Ушаччыны, крыху далей — слуцкі або рагачоўскі двор. Уся наша рэспубліка, як на далоні, на плошчы ў нейкіх сто гектараў. На невялікай плошчы — усе праявы помнікаў народнага будаўніцтва: жылога, грамадскага, вытворчага і іншых.

А паколькі людзі не жывуць і не жылі ў пустых хатах, то для хаты кожнага рэгіёна павінна быць і мясцовае ўбранства: розныя тыпы печак, мэблі, начынні, посуду, ткацтва, прадметаў быту — ад драўлянай лыжкі да гаршка, ад старых цымбалаў да сальнічкі.

А вакол хат — уласцівыя гэтай мясцовасці дворныя пабудовы. Сад, у якім мясцовыя пароды дрэў, агарод, у якім расце самая распаўсюджаная ў гэтай мясцовасці гародніна. Словам, усё гэта дзеля таго, каб вы, скажам, прывезлі ў музей сваіх дзяцей-мінчан, прывялі іх да полацкай хаты і сказалі ім: "Вось так, дзеці, жылі вашы дзяды. Гэта — ваша гісторыя. Яны былі працавітыя, простыя людзі. Але яны ўмелі не толькі працаваць. У іх было незвычайнае пачуццё прыгожага. Глядзіце, які посуд, як прыгожа і спрытна сплецена гэтая вярэнька, якія гожыя забаўкі, як меладычна гучаць іхнія музычныя інструменты…"

Але не толькі мінчанам, а і палачанам будзе цікава ўбачыць у музеі "полацкую" хату. Бо і на Полаччыне іх, тыповых, засталося вельмі мала. І мала хто іх бачыў: атрыбуты народнага побыту і культуры ўсё больш і больш знікаюць.

Працэс гэты няўхільны, але мы павінны зберагчы тое, што засталося. І пакуль што шмат яшчэ можна знайсці ў многіх вёсках багатых і каштоўных для музея матэрыялаў. Так што трэба спяшацца.

…Школа патрыятызму, школа павагі да працы і працоўных людзей, школа выхавання пачуццяў прыгожага на самых дасканалых, вякамі адточаных, народных узорах — вось што такое музей пад адкрытым небам.

У чым канкрэтна можа выявіцца дапамога грамадскасці будучаму музею? Ну, перш за ўсё, каб кожны з нас не застаўся раўнадушным да гэтай справы, зрабіў спіс старых пабудоў у сваім раёне, сельсавеце, вёсцы. У спіс гэты (а ён можа складацца нават з аднаго-двух цікавых старых будынкаў, што збярэгліся ў наваколлі) павінна ўвайсці самае цікавае, самае адметнае. Старыя хаты розных тыпаў і канструкцый, розных планіровак, разнастайных формаў страхі або даху, з рознымі ўпрыгожваннямі на ліштвах, вушаках, франтонах. Разнастайныя тыпы двароў, агароджаў, гаспадарчых пабудоў — свіран, пуня, адрына, млыны паравыя і вадзяныя, ветракі, варыўні, скляпы (лёхі), паветкі, хлявы, цікавай формы студні, сыраварні, вяндлярні, азярыны рознай формы.

Не мінайце ўвагаю старыя кузні з усім начыннем, ганчарні і ганчарныя печы, майстэрні для насякання жорнаў, смалярні, дзе яны збярэгліся, стальмашні, буды (спецыяльныя печы для вытворчасці паташу, выпальвання драўлянага вугалю) і многае, многае іншае.

Безумоўна, у хатах (земляроба, рыбака, пчаляра, палясоўшчыка і г.д.) павінна быць і адпаведнае начынне, рэчы, прылады, якімі карысталіся людзі. Усё тое, чым працаваў там калісьці наш працоўны чалавек, чым ён жыў. З гэтай прычыны значную цікавасць для музея ўяўляе даўняя мэбля: сталы, лавы, зэдлікі, шафы, канапы (не тыя, што зараз, а проста лавы са спінкай), скрыні простыя і маляваныя і г.д. Фатаграфуйце або рабіце замалёўкі асабліва цікавых даўніх печак з іхнімі нішамі і выступамі для размяшчэння розных прылад. Магчыма, камусьці пашанцуе знайсці печ з "комінам" (раней так называўся абмазаны глінай конус-дымаход з лазы, пад якім гарэла лучына).

Будучы музей зацікавяць таксама вырабы з воўны, лёну, канопляў, скуры, посцілкі, вышываныя ручнікі (наўрад ці якая гаспадыня — асабліва калі імя яе будзе ўпамянута — адмовіцца даць для музея нават "мамчын ручнік", калі ён упрыгожыць нейкую "пінскую" ці "віцебскую" хату), адзенне ўсіх узростаў, верхняе і ніжняе, для лета і для зімы, на свята і ў будні дзень, усе гэтыя "лятухі", "світкі", "буркі" і іншае, галаўныя ўборы, абутак ("пасталы", "поршні", "лапці", "апанкі", на поўначы — драўляны абутак, у якім выходзілі да жывёлы), паясы, упрыгожанні.

У спісе будучых экспанатаў абавязкова павінна быць рознае хатняе начынне (гаршкі, крынкі, драўляныя вёдры і цэбры, даёнкі

і г.д.), прылады земляробства і жывёлагадоўлі, а таксама прадметы, патрэбныя на свята і для абрадаў.

Перш за ўсё музычныя інструменты: дуды і дудкі, жалейкі, цымбалы, гуслі, старыя скрыпкі і басэтлі, бубны, дрымбы (жалезныя выразныя пласцінкі з язычком, на якіх іграліся сціснуўшы іх зубамі — гэта, галоўным чынам, на Палессі). Калі б нехта знайшоў батлейку з наборам (хай няпоўным) лялек — гэта быў бы добры падарунак будучаму музею.

І, вядома ж, нельга абмінуць увагаю творы народнай мастацкай творчасці: вышыўка наша і непаўторнае наша ткацтва, жывапіс, разьба, вырабы з гліны і дрэва, ільну і саломы, рогу і косці.

І яшчэ. Новаму музею будуць патрэбны не толькі жыллёвыя і гаспадарчыя пабудовы. Яму будуць патрэбныя і пабудовы культавыя, бо старую вёску цяжка ўявіць сабе хоць бы без капліцы. Таму неабходна ўзяць на ўлік старыя драўляныя цэрквы (а таксама старыя абразы, іканастасы і іншае ў іх), капліцы, старадаўнія драўляныя званіцы. Гэта таксама тое, чым жыла яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў назад наша вёска.

Па складзеных спісках вучоныя, архітэктары, гісторыкі — усе знаўцы даўніны адбяруць самае-самае вартае, разбяруць будыніну, перасыплюць у выпадку патрэбы, перавязуць і паставяць на тэрыторыі будучага музея пад адкрытым небам. Каб людзі з усіх канцоў, з усіх краін дзівіліся будаўнічаму генію нашага чалавека.

Ужо зараз установы, прадпрыемствы і асобныя грамадзяне могуць пачаць збор экспанатаў народнага быту для будучага музея пад адкрытым небам. Дасылаць іх можна па адрасе: г. Мінск, Міністэрства культуры БССР, арганізацыйная група. І абавязкова ўказваць на кожным экспанаце: дзе, у каго, калі і пры якіх абставінах ён быў знойдзены.

Міністэрству культуры БССР варта было б падумаць аб тым, каб людзей, якія прыслалі найбольш цікавыя знаходкі, нейкім чынам заахвочваць і пра знаходкі гэтыя шырока паведамляць у прэсе. Гэта будзе стымуляваць людзей, падахвоціць іх, прымусіць яшчэ больш актыўна збіраць экспанаты для будучага музея, дасць лепшую арыенціроўку на тое, што, як і дзе шукаць, у якім напрамку весці пошукі.

Словам, праца наперадзе чакаецца вялікая. Але гэта — высакародная, удзячная праца. Наш агульны клопат цяпер — садзейнічаць як мага хутчэйшаму адкрыццю будучага музея, зрабіць яго дзейсным сродкам ідэйна-маральнага і эстэтычнага выхавання працоўных.

Родная мова

Дзве старонкі, дваццаць ці дзвесце… А можа, тысячы тысяч? Усё адно, нават іх будзе мала, каб годна ўславіць цябе, родная беларуская мова. Таму што мільёны тваіх людзей самім існаваннем сваім з самага пачатку дзён кожным трапным словам, кожнай любоўнай ці гнеўнай думкай, кожным знішчальным, здзеклівым, іранічным або, наадварот, добрым, лірычным сказам славяць цябе. І славіць будуць, пакуль не скончыцца жыццё людское і думка людская на Зямлі.

Мова Скарыны і Буднага, мова Багдановіча і Купалы, Багушэвіча і Коласа, мова соцень геніяў, што яшчэ прыйдуць. Мова інтэлігентаў беларускіх, імя якім — легіён. Мова настаўнікаў і паэтаў, вучоных і кампазітараў, але перш за ўсё мова дзесяці мільёнаў людзей па ўсім свеце — ад Уругвая да Далёкага Усходу і, галоўнае, на нашай беларускай зямлі.

Мова першай матчынай калыханкі і апошняга "бывай", мова старадаўніх архіваў і новых школ на Палессі, мова пажаўцелых статутаў і мова кахання. Мова плытагонаў, сялян, акадэмікаў і шахцёраў на саляных капальнях. Мова, якая можа ўсё; можа сказаць словы невыказанай пяшчоты і можа ўдарыць так, што не ўстанеш. Гнуткі, спявучы, адвечна новы інструмант, без якога нельга ўявіць сабе сваё жыццё, без якога радасць не ў радасць, каханне не ў каханне, бяседа не ў бяседу, сяброўства не ў сяброўства і нянавісць не ў нянавісць.

Няма цябе — і вось няма суцяшэння ў горы. Няма цябе — і вось нямы язык, і нельга сказаць словаў радасці. А калі ўбіць сабе у галаву цалкам дурную думку, што ў нейкім далёкім будучым цябе не будзе, то… нашто нам тады такая будучыня?

Таму што ўсе мы — ад настаўніка да паэта — любім цябе, таму што ты — самы важлівы наш здабытак, і мы ў меру сіл нашых не дазваляем і не будзем дазваляць, каб нехта выказваў да цябе пагарду.

Тым больш дзіка, што яшчэ нядаўна зламысныя ёлупы прарочылі табе знікненне. Мала таго, самі дбалі аб ім са стараннем, вартым лепшага ўжывання. Што ж, Іваны Бязродныя вартыя толькі пагарды, як усе тыя, якія, адвярнуўшыся, праходзяць ля матчынай хаты.

Яны проста не ведаюць, які ўдзел рыхтуе лёс таму чалавеку, які пазбавіўся мовы. А каб ведалі, то жахнуліся б. Толькі ж нават гэтага не дадзена іхнім бедным мазгам.

…Старая хроніка данесла да нас жудасную і горкую гісторыю.

Тэўтоны захапілі землі прусаў, і старая пруская мова паступова знікла, і вось на турнір мейстэрзінгераў прыйшоў апошні прускі спявак і паэт — вайдэлот. Ён спяваў дзівосныя песні пра подзвігі продкаў, пра каханне і смеласць, пра вернасць і дружбу. Ён апяваў прыгажосць сваёй зямлі, але ніхто яго не разумеў. Яму не далі скончыць, бо рыцары рагаталі, як ашалелыя. І паднеслі старому вайдэлоту прыз… сто гарэхаў свістуноў.

Глыбокі сэнс гэтай гісторыі ясны, як божы дзень: нямы той чалавек, які забыў мову продкаў, і не можа ён спаўна выліць сваю душу, выявіць сябе. Па пальцах можна пералічыць выпадкі, калі, напрыклад, пісьменнік стварае на чужой мове нешта нават не геніяльнае, а проста вартае друкавання, а не сметніка (скажам, паляк Кажанеўскі стаў англійскім пісьменнікам Джозефам Конрадам). Але нават геніяльны Пушкін, дасканала ведаючы французскую, пісаў на ёй дужа пасрэдныя вершы. Тое самае можна сказаць пра польскія вершы Лучыны і рускія — Багдановіча. А яны ж таксама большую частку жыцця чулі рускую і польскую.

Нібы нейкі лёс неўблажымы кіруе рукою таго, хто піша. Нібы цень маці, прамаці ўсіх продкаў, што прайшлі па зямлі з дня з'яўлення на ёй людзей і народаў. І калі пачынаеш пісаць не так, як думалі і гаварылі яны, — немінуча пачынаеш фальшывіць.

У старадаўнія часы, калі яшчэ не склаліся нацыі, мова магла зрабіцца мёртвай мовай, як латынь. Але і тады мовы былі практычна неўміручыя. Тая ж самая латынь не толькі нарадзіла ўсю сям'ю раманаўскіх моў — ад Аргенціны да Румыніі, - не толькі, будучы ўжо мёртвай, цэлымі стагоддзямі была мовай паэзіі і навукі, але і зараз уплывае на нас творамі Катула і Вергілія, Гарацыя і Авідзія, прымушаючы нас смяяцца і плакаць. Што ўжо хадзіць далёка за прыкладам: новая беларуская літаратура пачыналася з пераробкі Вергіліевай "Энеіды", і той жа самы Вергілій вадзіў па пекле заснавальніка новай італьянскай паэзіі, першага паэта новага часу Дантэ.

У новы час скон немагчымы для кожнай больш-менш развітай мовы. Нават неразвітая ўладна ўплывае на сваіх сыноў. Ян Баршчэўскі ў мінулым стагоддзі напісаў па-польску "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях", але і зараз мала хто з такой выразнасцю паказаў быт беларуса, псіхічны склад ягонай душы, яго нацыянальны характар і самую Беларусь. Міцкевіч піша па-польску, але рэаліі яго твораў цалкам беларускія, але і старэйшыя і навейшыя яго даследчыкі лічаць, што сам склад яго мыслення быў беларускі, але творы ягоныя страката перасыпаны вялікім мноствам беларускіх слоў і тых беларуска-польскіх барбарызмаў, што былі ўласцівы шляхце

беларускага паходжання. Нездарма ж у паэта Канстанты Галчыньскага ёсць верш, герой якога, чытаючы Міцкевіча, нападае на слова "свежоп", перагортвае ўсе, якія ёсць, слоўнікі польскай мовы, не знаходзіць такога і, не смеючы не верыць Міцкевічу, з'язджае з розуму.

Ужо шэпчуць вакол:
Што гэта зрабілася
з хлопца!
Дзякую, пане Адам!!!
Я ахвяра свежопа.

(Пераклад. — У.К.)

А на самай справе Міцкевіч проста "паляпізаваў" звычайную беларускую "свірэпку" або "свірэп".

Не толькі беларусізмы былі ў яго творчасці. Чытаючы ў Парыжы лекцыі аб славянах, ён сказаў пра беларускую мову, што гэта найбагацейшая і найчысцейшая з усходнеславяскіх моў, адзначаная ўзнёслай прастатой.

Мова неўміручая. Воляю абставін ірландцы, напрыклад, амаль страцілі яе. Свіф, і Уайльд, і Шоў, і дзесяткі іншых людзей, што з'яўляюцца гонарам англійскай літаратуры, былі ірландцы, любілі свой народ, але пісалі воляю няшчасных абставін па-англійску. І вось цяпер ірландская, як і валлійская, баскская, іўрыт, як мовы народаў Афрыкі, якія сотні год ляжалі ў заняпадзе, усталі. Бо мова — душа народа, і толькі на ёй можа народ найбольш поўна выказаць сябе.

Наш лёс таксама быў такі. З часоў росквіту старажытнай беларускай мовы прайшлі стагоддзі вынарадавання, забыцця, свядомага забойства. Акрамя гушчы народнай толькі ў нешматлікіх прыватных школах з закуранымі бэлькамі, у школах, дзе настаўнічалі адстаўныя салдаты ці старыя дзячкі і дзе вучылі акрамя псалціры хіба начаткам пісьма і лічэння, гучала яшчэ беларуская мова. Але было гэта ад беднасці, а не ад багацця.

Кніганошы насілі кнігі з-за мяжы. І за гэтыя беларускія кнігі ім часта плацілі кулямі салдаты з кардонаў. Але ніхто ўсё адно не мог адштурхнуць народ ад сваёй кнігі.

Кнігі палілі, супраць іх выдавалі ўказы, забаранялі самыя словы "беларуская мова". Але ўсё гэта, як і насмяханне над "паўночна-заходнім нарэччам" — нічога не дало і не магло даць, пакуль беларуская баба стаяла з рагачом ля печкі, пакуль гэтая баба спявала калыханку над ліповай калыскай.

Мала таго, усе разумелі ўсё з большай яснасцю, што без яе,

без гэтай мовы, немагчыма. Яна ўладна грукала ў светавыя дзверы.

Нават панам і гандлярам яна неабходная.

"Моцныя свету гэтага, — без яе вы падсячэце ногі эканоміцы і разваліце гаспадарку, бо не на французскай жа вам размаўляць з тымі, хто працуе, і без каго вы здохлі б з голаду!"

Але, не кажучы ўжо аб гэтай публіцы, яна неабходная і сапраўдным.

"Фальклярысты — вы збядніце чалавецтва на адзін з самых багатых фальклораў на зямлі". І вось забароненая мова, амаль разбураная ў сваёй літаратурнай, друкаванай галіне, рассыпаецца самацветамі ў запісах Шэйна, Раманава, Федароўскага і многіх дзесяткаў іншых.

Лінгвісты таксама пачынаюць разумець, што беларуская мова гэта скарб таго, што вымерла ў другіх мовах, што, акрамя самастойнай вялікай каштоўнасці, яна — запаведнік, у якім "сохранилось очень много древнего и важного для истории" (И. И. Срезневский), і без ведання якога немагчыма славянскае мовазнаўства наогул, немагчыма вывучэнне і зразуменне іншых славянскіх моў і іхняй гісторыі.

Рэлікт? Так, калі хочаце, рэлікт, які перажыў стагоддзі. Але рэлікт, што расце, развіваецца, дыхае, ідзе наперад волатавымі крокамі, які жыве і будзе жыць вечна.

Усе пачынаюць больш і больш разумець гэта. Сама гісторыя ўладна і неабходна штурхае на прызнанне, на павагу, на захапленне багаццем і прыгажосцю беларускай мовы. І нават тыя, што адышлі ад яе — я разумею найлепшых з іх, — рана ці позна вяртаюцца да звонкага дзе і густога чаго. Бо толькі так ім можна сказаць усё.

Чачот запісвае народныя песні і сам складае вершы па ўзору гэтых песень. Марцінкевіч ад польскага верша прыходзіць спачатку да беларускіх, не вельмі яшчэ спрытных вершаў, а пасля стварае шэдэўр менавіта беларускай па мове і антуражу драматургіі — "Пінскую шляхту".

Усё, здавалася б, занядбана, але невядомы піша "Тараса на Парнасе" і яго ведае на памяць бадай што кожны беларус. І вось Багушэвіч, якому й бог загадаў, здавалася б, па выхаванні і становішчу, забыць усё — выбухае палымянымі радкамі ў абарону ўсяго гэтага, забытага, стаптанага царамі і саноўнай сволаччу. І грыміць супраць ворагаў мовы і народа голас Каліноўскага. І ўжо ў слоўнік Насовіча ўваходзіць больш за трыццаць тысяч адметных, паўнакроўных, жывых, іскрамётных слоў. І ўжо геній Купалы і Багдановіча ўстае над зямлёй і займаецца над ёю далёкі яшчэ пакуль водсвет заранкі.

Першыя настаўнікі выходзяць на новую ніву. І гэта іхняй неўміручай працы, іхняму дбанню, іхнім бяссонным начам у многім і многім павінны мы быць удзячнымі за тое, што мова наша стала яваю для мільёнаў, што яна мае права патрабаваць такой жа самай павагі, як і ўсе мовы зямлі.

Мы (я кажу "мы", бо я таксама былы настаўнік) ніколі не павінны забываць, наколькі годная наша праца і хто стаяў ля яе вытокаў. А стаялі ля гэтых вытокаў, самі настаўнічалі, самі складалі першыя буквары і чытанкі Цётка, Купала і Колас. І, мяркуючы па ўсім, някепска ведалі сваю справу і зусім нядрэнна правялі яе ў жыццё. Яшчэ на зары нашага стагоддзя.

Дбаннем іх і соцень іншых мова набірае сілу, цвёрдая, як сталь, грубая, як сялянскія далоні, і пяшчотная, як спеў беларускага гівала. Яшчэ часам запінаючыся на абстрактных тэрмінах, яшчэ нясмела вымаўляючы навуковыя і філасофскія тэрміны — яна ўладна бярэ разбег. Яе ўжо не стрымаць. Першая сучасная трагедыя (я не маю на ўвазе сярэдневяковых містэрый і аповесцяў), першы раман, першая паэма — і паўсюль глыбокая зямляная праўда і дыяменты дажджу на пахучых майскіх галінах, і што ні слова, то жэмчуг падае на срэбны шчыт. І як бы часам ні было цяжка — з ёй ужо нічога не могуць зрабіць, як бы ні душылі — яна ўстае. І з атмасферы семінарыі, з яе мёртвай царкоўнаславяншчынай выходзіць Якуб Колас, а са сцен школы, дзе вучаць "хто ты естэсь?" — адзін з найлепшых сучасных празаікаў Янка Брыль. Беззямельныя перасяленцы цягнуцца на Далёкі Усход — і праз семдзесят год я чую ў беларускіх вёсках на Усуры і Суйфуне яе, маю мову, нечапаную, родную, адвечна сваю. Прыходзяць і адыходзяць акупанты, усе гэтыя пілсудчыкі і эсэсманы, і след іхні знікае на твары зямным — а яна стаіць, бо карані яе ў глыбінях, дзе спяць тыя, хто стагоддзямі песціў, шліфаваў, бярог яе, лаканічную, гнуткую і цвёрдую адначасова, спявучую, тую, што з найлепшай яснасцю і дакладнасцю перадае думку чалавека, які жыве між Гродняй і Оршай, між Асвеяй і Лельчыцамі. Думку тых, якія казалі: "Хай не будзе ў таго святла, хто на досвітку табе здрадзе."

Яна вечная, бо ўся яна як наш характар. Здаецца, кволая ад пяшчотнай мяккасці, яна раптам кідае наверх схаваную ад усіх жалезную мужнасць і сілу. І, як быццам дамогшыся свайго, б'е, як перапёлка ў жытах — мякка, а за тры вярсты чуваць. "Эль" — як салодкае віно, "дзе" — як шкляной палачкай па крышталю, мяккае "с", як соннае ціўканне сінічкі ў гнязде. І побач "р", як гарошына ў свістку, і доўга, спявуча, адкрыта гучаць галосныя. А "г" прыдыхае так ласкава, як маці на лобік дзецку, каб перастаў сніць дрэнны сон.

Дык што ж лепей за цябе, мова мая, мова наша?! За цябе, даўняя, за цябе, вечна жывая, за цябе, неўміручая?!

І ў тым, што жывая ты, што неўміручая ты, павінны ўсе мы. Сялянка, што спявае, варушачы сена, — і чалавек, які складае слоўнік, дзеці, што гуляюць у "піва", — і дзяды, што баюць аб даўнім, паэты і вучоныя. Але яшчэ — і гэта ледзь не самае важнае — у тым, што ты неўміручая — шмат заслугі першай настаўніцы школьнай і выкладача літаратуры ў выпускным класе.

Іхняму таленту, няўрымслівасці, працавітасці і любові мы павінны дзякаваць за тое, што ты моцна, уладна і назаўсёды пасяляешся ў душах дзяцей, якія потым стануць дарослымі і самі будуць мець дзяцей і ўнукаў. А ў гэтых дзяцей і ўнукаў таксама будуць настаўнікі — праваднікі вялікіх ідэй чалавецтва ў дзіцячыя душы.

Праваднікі вялікіх ідэй на вялікай роднай мове і таму самі вялікія людзі.

Ці дажывем да ста год, або пасмяротнае рыданне

Пану Ф. Н., які быў сведкам гэтай праўдзівай і журботнай гісторыі

Цярпець не магу анкет, апытанняў і тэстаў. Па-мойму, гэта толькі задурванне галавы добраму чалавеку. А пайшла ж на іх за апошнія гады нейкая паскудная мода!

"Колькі год было вашай стрыечнай бабцы, калі яна трэці раз выйшла замуж?" (А колькі тыдняў было пазалеташняму снегу?) "Як вы ставіцеся да знешняй і ўнутранай палітыкі прэзідэнта Хрэніі Бумба Юмба?" (Так я вам і сказаў бы, нават калі б ведаў.) "Якой вы думкі аб творчасці NN?" (Мог бы і праўду сказаць, але ён жыве са мною ў адным квартале.) "Ці знаходзіцеся вы ў сваяцтве з Радзівіламі? У якім?" (Не. Ні ў якім. З адной Радзівіловай аднойчы выпіў пару-другую кяліхаў. Ёй шэсцьдзесят год. І яна харошы чалавек, лепшы, чым многія мае сучаснікі.) "Што штурхнула вас на напісанне таго і таго?" (Вось бы суцешыліся, калі б сказаў: "Грошы".)

Або пытанні ад шаноўных даследчых інстытутаў у акадэміях навук. "Якія каляровыя асацыяцыі выклікае ў вас знак "0"? (Ніякіх. Нуль, ён і ёсць нуль. Нуль хлеба, нуль віна, нуль заробкаў.) "Ці бачыце вы колеры, слухаючы музыку? З якімі колерамі асацыіруецца ў вас творчасць Чайкоўскага? Вячасава Адамчыка? Брамса? Рыгора Барадуліна?" (Божа, каб я ведаў, з якімі!)

Назолы страшэнныя — і я ведаю чаму. Апытаюць 50 чалавек — і гатова дысертацыя, толькі склеіць трэба. Але да клею ім не прывыкаць. І каб хоць запісваў са слоў, а тое намагаецца, каб лягчэй, атрымаць адказы пісьмовыя.

Але асабліва я цярпець не магу анкет, апытанняў і тэстаў польскіх. Сырцом бы іх з'еў! Нахабства неверагоднае. Ненавіджу! Чаму? А вось чаму… і няхай пасля майго апавядання нехта са мной не згодзіцца…

…Сядзім неяк у віруючай Варшаве, у інтэлігентнай прафесарскай кватэры. Я, жонка і гаспадар хаты, мой друг. Мы з гаспадаром каву п'ем, а жонка, як Юлі Цэзар, займаецца адразу трыма справамі: п'е каву, чытае "Kobieta i zycie" ("Кабета, значыцца, і жыццё") і меле языком бесперапынку.

- Слухай, — кажа раптам. — Ці не хацеў бы ты застрахаваць

жыццё?

- Тваё?

- Не, сваё.

Адкуль у яе раптам такія тагасветныя ідэі з'явіліся? Хоць і жанчына, але няма ж і ў іх дыму без агню.

- А колькі? — пытаецца ўва мне загартаваны матар'яліст.

- Чатырыста рублёў праз тры гады?

- А што мне трэба рабіць праз тры гады?

- Атрымаць грошы.

- Ламіць нічога не трэба? Руку? Нагу? Шыю?

- Можна і такое.

Адчуў я за гэтым нешта падступнае. Усё адно як сабрат па пяру цябе пытае аб тым, што ты пішаш. Але змаўчаў. А яна раптам:

- Ой, як цікава! Гляньце, што ў часопісе.

А там тлустая назва: "Ці дажывём да ста год?" А зверху лозунг: "Варажэнне з… навыкаў". І словы, што некалі варажылі на картах ці на кававай гушчы (цяпер верны быў бы спосаб вылецець у трубу), а мы — на сямейных дадзеных і найпрасцейшых прывычках чалавека. І табліца, колькі яшчэ год перад табою, смяротны. І подпіс. Нейкая доктар псіхалагічных навук Diana S. Woodruff. А ніжэй таблічка. Калі табе зараз 21 год і ты мужчына (а хто з мужчын на добрую ахвоту прызнаецца ў адваротным?), то жыць табе 70,6 года, калі жанчына — 76,4 гады. Ну і гэтак далей.

- Ой, цікавасць якая! — сказала жонка. — Давай паварожым.

- Гэ-эх, а яшчэ член прафсаюза. Ну ладна ўжо я. А вы? Шэрасць вы былі, шэрасць і засталіся, як сказаў малады чалавек акадэміку Паўлаву, калі той хрысціўся на храм… Ну, вось твая лічба. Маеш шансы дажыць да 77,4 год. Хопіць яшчэ з цябе… Хочаш — паваражы, няхай…

- А ты? Раней ты.

- Гэта ўсё адно як у Назарэі піраміду будаваць збіраліся, то тыя сказалі: "Паспрабуем раней у Егіпце"… Дзівачка! То размовы аб страхоўцы, то — колькі пражыву.

- Ды не. Вось, шукай сваю лічбу.

Узяў я "Кабету". (Шчаслівец мой польскі друг, яму рэдка калі выпадае на яе падпісацца, не тое што ў нас. Віншую яго.)

Адшукаў свае лічбы. Мне 46. Я мужчына.

- Ну вось, — кажу. — Пражыву 72,7 гады. Калі, вядома, на мяне цэгла з мура не ўпадзе.

- А ты трымайся далей ад новых дамоў.

- Далей ад дамоў — вуліца. А там — аўтамабілі.

- А ты хадзі толькі па тратуарах, — з чароўнай жаночай логікай заяўляе яна. — Ну, хопіць. Ты не да канца прачытаў. Там

яшчэ трэба плюсаваць або мінусаваць.

- Чаго?

- Розныя рэчы.

Тут я адразу засумаваў. Плюсаваць — гэта не па маёй частцы (мінусаваць хаця сяк-так навучыўся). Гэта жонка майстар: "Адзін пішам, два на вум кладзем". А я, сорам прызнацца, нават табліцу множання збіваюся, і няма мне ў гэтым памочніка, як раней. (Раней яна друкавалася на апошняй вокладцы сшытка, а цяпер… А яшчэ кажуць, ракаліі і паршыўцы, што свет ідзе да лепшага, калі ніякага клопату аб чалавеку і яго мазгах).

А што, калі кепскае наварожыш? І не паспееш — на шчасце чытачоў, на гора сабе — кнігу скончыць?

Чытаю першы раздзел.

Гады, якія наследуем. Ці ёсць твая даўгавечнасць якасцю сямейнай?

- Ці дажылі дзяды да васьмідзесяці?

- Ну, дзед дажыў. І невядома, колькі б пражыў, каб не вайна, на якой столькі іх ляжыць, патэнцыяльных стогадовых.

Адразу ў мяне настрой сапсуўся. Пабывалі б вы, доктар Дыяна, на вайне. Але плюсую сабе два гады. Малайчына дзед. А вось бабка падвяла. Памерла рана ад хваробы, якая цяпер не страшней катару. Мінусуем два, і застаюся я пры сваіх інтарэсах.

- Ці мае твая матка 80 год?

- Так. Нават 84. Дай Бог ёй здароўя. Маю ў плюсе паўтара гады.

- Бацька?

- Нуль я тут маю. Пражыў 72 гады. Не піў, не курыў, перажыў удала шэсць войнаў і дзве рэвалюцыі. Пражыць павінен быў бы, па табліцы, сама меней 79. І чаго ён так?

- Ці хварэў хто са сваякоў перад шасцюдзесяццю на сэрца? Не. На дыябет? Так, адзін, — мінус тры ачкі. На жалезы ўнутранай сакрэцыі? Не. На пухліны? Не. На астму? Не.

Ну вось. Не хварэлі, ані дэбету, ані крэдыту. Чатыры нулі. Добра, што хаця не аднялі ў мяне гэтыя нулі дванаццаці гадоў. Ну і, вядома, сваякам добра.

Разумніца анкета.

Наступны яе раздзел. Гады, якія прапрацавалі.

- Якая асвета? Калі пачатковая — дадаем адзін год. Сярэдняя — два. Вышэйшая — тры.

- Дзіўна, — сказаў сябар, — я думаў, наадварот.

- Тут сказана, што павышаецца тады ўзровень жыцця, — сказала жонка. — І веды пра рацыянальнае харчаванне і вобраз гэтага жыцця.

- А калі асвета царкоўна-парафіяльная, а ўзровень жыцця на

дзесяць універсітэтаў? — спытаў я.

- Выключаецца, — сказала жонка.

- А калі шафёр зарабляе больш за кандыдата? — спытаў сябар.

- Не можа гэтага быць, — сказала жонка.

- Адзін — малатабоец і сала есць, — змрочна сказаў я. — Другі — аперацыі робіць, усё пра рацыянальнасць ведае, у анатоміі з фізіялогіяй дока, ведае, якое жыццё самае нармальнае, часам інстытутам геранталогіі кіруе, а глядзіш — за яго труною, сярод іншых, ідуць пяцьдзесят чорнарабочых з ніжэйшай асветай. А пасля, за ўспамін душанькі, сала ядуць і чаркай запіваюць.

- І, па-мойму, — сказаў сябра, — ад добрага заробку і вышэйшай асветы (калі ўжо такое спалучаецца) толькі лішняя вага ды стрэсы. Во, і ў табліцы далей так сказана. То каму на свеце пасля такога верыць?

Спрачацца пачалі. Набаўлялі. Прыбаўлялі. Аж пакуль крыху не заблыталіся, як той чалавек, у якога пляменнік (а быў ён старэйшы за далёкага дзядзьку) ажаніўся з траюраднай сястрой дзядзькі, а яе дачка пайшла замуж за дзядзькавага сына, а брат сына… Словам, урэшце выявілася, што дзядзька сам сабе бабуля. І да таго часу ён разбіраўся ў гэтым сваім сваяцтве, аж пакуль яго ледзь не звезлі ў Навінкі.

- Досыць, — перарваў я. — Тры вышэйшыя асветы ў мяне. Дзевяць год ганіце.

- Пра тры нічога не сказана, — зайздрасна сказала жонка.

- Няхай, няхай адна. Давайце мае тры гады.

"Прафесія? — пытае анкета далей. — Калі твая прафесія звязана з тым ВНУ, якую ты скончыў, - дабаў 2 гады. Адвакат, настаўнік — дадай тры. Архітэктар, музыкант, фармацэўт, лекар — 1 год".

Пра маю прафесію нічога. А хто я, сапраўды. І адвакат, і настаўнік, і архітэктар, і з музеямі звязаны, і з музыкай. Шматстаночнік. Як казаў адзін дзед: "Во ў мяне быў зяць дык зяць! Ён табе і сталяр, ён табе і цесля, ён табе і бондар, ён табе і брыгадзір, ён табе і злодзей, ён табе і старшыня мясцкома".

Прыбаўляў, адбаўляў. Адбаўляў — прыбаўляў. Урэшце з уздыхам паставіў сабе два гады. З плюсам.

"Колькі зарабляеш?! — як фінінспектар, грозна пытае анкета. — Калі ацэньваеш свой заробак як вельмі добры — адліч два гады".

- А-а чаму адлічаць, калі добры заробак?

- Таму, што ў такіх часцей стрэсы, і ядуць яны зашмат і нерацыянальна, — павучальна, як быццам раней ведаў, сказаў я.

- А я ж і гаварыў, - сказаў сябар. — А раней казалі тут жа пра

вышэйшую асвету, заробак і веданне, як харчавацца добра, а як дрэнна. Дзе логіка?

- Асвета — гэта яшчэ не заробак, — паўтарыў я. — І веданне яшчэ не ўсё. Ведае чалавек, што вячэру трэба аддаць ворагу, а сам павячэрае такой яешняй, што і сучка не пераскочыць, ды яшчэ і набярэцца, як жаба гразі.

- Фу, — сказала жонка. — Як ты, урэшце, выражаешся?

- На чыстай беларускай, — раздражнена сказаў я. — Вось ты? Ведаеш, што каву нанач піць дрэнна? Ведаеш. А ўжо трэцюю п'еш. А з вышэйшай асветай і з добрым заробкам.

- Не добры ён у мяне. Нават горшы, чым у цябе.

- Першы раз прызналася. Звычайна наадварот пілуеш. Усе вушы аб'ела… эмансіпіраваная жанчына. Феміністка.

- Ведаеш, — уздыхнула жонка, — я, як амаль усе жанчыны, з ахвотаю б назад разэмансіпіравалася.

- Не трэба было ланцугамі да лавы ў парламенце прыкоўвацца. І кіслату ў паштовыя скрынкі ліць. Дазмагаліся, кабеткі.

- Нашы дазмагаліся, — уздыхнуў сябар. — Сядзяць па кавярнях, а мужыкі ім на вячэру гатуюць эсцюржон а ля рюс.

- Ой, а што гэта такое? — спытала жонка. — А ты мне згатуеш?

- І ў ложак падам, — сказаў я. — Гэта асятрына па-руску. Толькі, пакуль я жывы, у нашай, у маёй краіне такога не будзе. Ніякая канстытуцыя яшчэ не забяспечвала мужчыне роўных правоў з жанчынай. І наша, мая таксама.

Стала мне маркотна:

"Дурацкая анкета. Мела рацыю жонка. Няма такога чалавека, які ацэньваў бы свой заробак як вельмі добры. І хаця я ем мала, але стрэсаў у мяне на цэлы Кітай хапае. Але паколькі людзі некаторыя кажуць і табе так хочацца — ладна, адкінем два гады. Нам не шкада".

"Ці вымагае ваша праца безупыннага руху? — пранырліва і подла пытае анкета. — Ці, наадварот, вы праседжваеце за сталом з раніцы да вечара? У першым выпадку тры з плюсам, у другім — шэсць з мінусам".

- Ну што мне тут сказаць? — жаласна разгубіўся я. — Спачатку сяджу за сталом з раніцы да вечара. А пасля, як скончыш, пачынаецца ўжо і нястомны рух з раніцы да вечара. На дні, месяцы, гады. А пасля зноў сядзенне за сталом з раніцы да вечара. З патрэбнымі і зычлівымі людзьмі. А пасля зноў сядзенне за сталом з раніцы да вечара. А пасля зноў рух безупынны.

- Які гэта рух? — спытала жонка.

- А рэдакцыі. Тут толькі і адпачываеш. У Польшчы. Сёння

аглядзеў Віланаў, пасля да Лазенак, пасля пешшу да Старога Мяста, пасля па трох музеях, пасля пешшу на Руткаўскега, былую Хмельную. І так прыемна адпачываюць ногі. Не тое што ў Дом друку, пасля да машыністкі (восьмы паверх з сапсутым ліфтам), пасля пешшу на кінастудыю (гадзіны пік), пасля ў адну рэдакцыю, пасля ў оперны, пасля ў другую рэдакцыю, пасля… Ногі вы мае, ногі…

- Але сядзець больш даводзіцца? — спытаў сябар. — За сталом. І спачатку, і пасля.

- Твая праўда. Рэж тры гады. Ну, усё адно, мабыць, жыць будзем з усімі надбаўкамі год восемдзесят дзевяць — дзевяноста. Недзе гэтак да 2019 года. Эфектна, халера на яго! А мо паднапружымся на тры месяцы, і — уяўляеш, жонка? — 2020 год. Ф-ф-фу-у!

- Э-э не-е, — з нейкай незразумелай хцівасцю кажа жонка. — Тут вось далей раздзел: "Гады, якія самі сабе адлічваем".

- Ну нашто, нашто іх адлічваць? — Дужа мне спадабалася ідэя жыць у трэцім тысячагоддзі. Хаця б фізічна. Бо абяцаная на зямлі вечная слава канчаецца, часцей за ўсё, з апошнім, хто пайшоў дадому з цвінтара.

- Не-е, трэба па закону.

- Няхай. Я люблю закон… Без узаемнасці.

- За кожны кілаграм вагі звыш меры — адлічвай адзін год, — прачытала жонка.

- Ужо адлічыў, - сумна сказаў я. — Год. Год, за які я, можа, "Магілу льва" напісаў бы.

- Глупства, — сказала жонка. — Па-першае, не напісаў бы, я цябе ведаю. Па-другое, я год змагалася, каб пахудзець на пяць кіло, і за гэты час ні пра якія кнігі не думала, а толькі пра патэльню смажанай бульбы са скваркамі. І ў выніку…

- І ў выніку адлічы ад свайго жыцця два гады: адзін інтэлектуальны, другі — тыя пяць кіло, што не скінула, — сказаў я.

- Ці паліш? — замяла размову жонка. — Адлічвай, калі ніжэй дваццаці папярос у дзень — два гады, калі 20–40 — ад трох да сямі, больш, чым сорак — восем-дванаццаць год.

- Гэта як калі. Часам 20. А калі выклічуць куды ці ты пачынаеш біць у пастронкі, то й пяцьдзесят. Сячы галовы дванаццаці маім гадкам.

- "Ці п'еш? — пытае са значэннем, бы на дыване ў начальніка, анкета. — Калі трохі і ад часу да часу — далічы (!) тры гады. Калі горкі п'янчуга — адлічы восем".

- Што такое горкі п'яніца? — спытаў я.

- Ну той, хто адпівае, — сказаў друг. Хто адсёрбвае,

прысёрбвае, распівае, папівае, прыхлёбтвае, цягне, смокча, дудоліць, пацягвае, хвошча, глытае, дзьме, глокча, залівае, зашыбае, прыкладаецца, прымае, закладвае, прыкладаецца да бутэлькі, залівае за каўнер, трымаецца шклянкі, п'е без просыпу, мяртвецкі, горкую, п'яны як бэля, як бочка, п'е як конь. Той, хто алкаголік, алкаш, хто набіраецца, як жаба гразі, хто прапойца, не дурань выпіць, хто запівоха, пітух, півар, бражнік, паклоннік Бахуса і зялёнага змія. Хто нецвярозы, хмяльны, у стане ап'янення, касы, падгулялы, хто языком не варочае, у каго заплятык языкаецца.

- Ты што, мне слоўнік сінонімаў чытаеш?

- Не. А ўвогуле, я чытаў, што алкаголю, сухога віна, можна выпіць палову літра на год. Акадэмік адзін пісаў. Філосаф-медык. Здаецца, Кайгародскі. Ці ў "Літаратурцы", ці ў "Навуцы і жыцці".

- І я чытаў, - уздыхнуў я. — А што рабіць? Тут адных свят на год — сем, не лічачы рэлігійных, якія не святкуеш, але… Ды дзён нараджэння ў адной сям'і тры. Ды ў сяброў лепшых дзесяткі тры. Ды сваякоў паўсюль. Ды публікацыя ці кніга, ды… не, тут у паўлітру сухога не ўлезеш. Цяжкае жыццё, і спачынку няма. І таму я языком не варочаю, у куражы, лыка не вяжу, п'яны, як зюзя, падшафэ і ўвогуле гатоў.

Махнуў рукою:

- Не ўлезеш у акадэмікаву норму. Пішы, горкі. Пі маю кроў. Адбірай восем год. Адзінае суцяшэнне, што ў абстынентаў, у поўных цвярознікаў, адзін год адбіраецца. Таму што калі горкае п'янства прычына хвароб, то невялікая колькасць гарэлкі дапамагае перажыць стрэсы, дазваляе расслабіцца, а абстынент у выпадку стрэсу хаваецца за свае парашкі, а яны шкаднейшыя, чым чарка гарэлкі. Добра, што я хаця не абстынент.

- І я тое ж думаю, — з палёгкаю сказаў сябар. — Ну а далей.

- Далей, — драпежна кажа жонка, — гады, што залежаць ад цябе. Ці дбаеш аб форме? Рэжым, спорт, плаванне, пешы турызм, бег па інф… цьфу, па здароўе — далічы тры гады.

- З часу да часу. Нерэгулярна. Галоўным чынам у выглядзе пікнікоў.

- Не лічыцца. Ці клапоціцеся аб здароўі? Ці кантралюеце ціск і сэрца?

- Прымусова, — сказаў я. — У нас лекары такія — душу вымуць. Хоць бы Н. Д. Трапіш у кіпцюры — не вырвешся. Пра лечкамісію і не кажы. Гразіліся пяць метраў вантробы выразаць. А чаго мне тады вылічаць па чатырох папярэдніх пунктах?

- Плюс два.

- Ці любіш спаць?

- Люблю. Хаця і не заўсёды.

- Мінус чатыры.

"Ці ездзіш аўтамабілем? Ці ліхач, ці бравіруеш? Калі так — адлічы 2".

- Чужымі — езджу. Адлічаю — у сябе. Ім асалода без двух гадоў, а мне — страх без двух.

- Ці жанаты?

- Так.

- Далічвай тры гады.

- Да-ліч-вай? — абурыўся я. — Я б гэтыя тры — адлічваў. Ад-ліч-ваў. Толькі працаваць сядзеш (а жонка на работу ідзе): "Пойдзеш сёння свежым паветрам падыхаць?" — "Гадзіны праз чатыры хвілін на дзесяць". — "То ты за гэтыя хвіліны паглядзі, што ў рыбным, малака купі, хлеба, якія бра ў электрычным і лямпачак купі, папярос сабе, два кіло цукру, масла, а пасля пады хай, а пасля яшчэ папрацуй". Ідзеш, як ішак. Жанчына за год цягае 20 тон прыпасаў, мужчына — мінімум пяцьсот. Толькі сеў працаваць: "Прынясі мне кніжку". "А колькі зараз часу?" "А што табе па тэлефоне Аля казала?". "А нехта званіў". І як знак вышэйшага клопату ў момант натхнення: "Ці не з'еў бы ты чаго?" Колькі яны ў нас, у кожнага, жыцця ад'ядаюць? Мінімум дзесяць год… Ну ладна, прыпісвай паўтара гады. Слабае, але суцяшэнне.

"Ці спакойны характар? — спытала анкета. — Ураўнаважаны? Цярплівы? Калі так, то дапішыце па тры гады на кожную якасць. Калі агрэсіўны, запальчывы, поўны непакою — адлічыце па пяць год".

- Адлічвай пятнаццаць, — сказаў я. — Адкуль з такім жыццём быць ураўнаважаным? Спакойным? Цярплівым? Не!!! Я запальчывы, я неспакойны, я агрэсіўны. На ўсіх, а асабліва на гэты часопіс, і на вас, што ўцягнулі мяне ў гэтую гульню. Я… вельмі-вельмі страшны! Я… кусацца буду!

- У вялікім месцы жывеш ці на вёсцы? Плюс-мінус адзін год.

- Мінусь, — узроў я.

- Ці шчаслівыя вы? Калі адкажаце "так" без вагання — прыбаўце тры гады.

- А хто можа адказаць з пэўнасцю і без вагання, што ён шчаслівы?! Халера на ўсё. Лепшыя розумы, лепшыя філосафы свету, і тыя. А калі адказвалі так, то хлусілі.

"А калі ў вас клопаты, нязмерныя псіхічныя нагрузкі, пачуццё віны, — кінула анкета апошнюю саломінку, што зламіла вярблюду спіну, — то адкіньце тры гады".

- А ў каго няма клопатаў? У каго не перагружана псіхіка? А хто не мае пачуцця віны перад усімі людзьмі? Падлюгі хіба? — Я ўжо быў у ашалелай раз'юшанасці, амаль непрытомны.

А тыя пачалі ўжо сваю італьянскую бухгалтэрыю. Лічылі,

вылічалі, адбаўлялі і прыбаўлялі, а матэматыкі з іх былі, як з мяне.

- Бі іх, — роў я. — Бі дактароў навук! Бі друкароў! Бі пісьменнікаў! Анархія — маці парадку! Рэж, Янка, Бога няма!

- Ты не можаш нас рэзаць, — станоўча сказала жонка.

- Чаму не магу?!

- Ды ты ж дзевятнаццаць год назад памёр, — ахнула жонка.

- Як?

- Ну так. У 1958 годзе. Тут усё сказана. Па табліцы.

- Я ж тады толькі першую кнігу выпусціў! А астатнія дзевятнаццаць?!

- Падумаць толькі, - здзівілася жонка. — Ніколі б не паверыла ў такое. Мёртвы! Аж дзевятнаццаць!

Я затужыў. Праверыў. Сапраўды, так. І, як кожны мужчына, прызнаў рацыю жонкі і жаночага часопіса. Заўсёды яны ўсё ведаюць, заўсёды маюць рацыю. Вось хоць бы жонку ўзяць. Сядзім у тэатры. І раптам яна на ўсю залу сказала:

- Пабач, пабач, унь у першым радзе Дунін-Марцінкевіч сядзіць.

- Цс-с-с, — засычэў я. — Што за… Ён жа даўно памёр.

- Глядзі-і ты… А зусім як жывы…

Я толькі рукой махнуў. Махнуў і на гэты раз. Заставайся пры сваім. Суцэльны дэбет пасіву.

А ўсё клятыя анкеты, каб ім згарэць.

І вось людзі жывуць, смяюцца, кнігі пішуць, а я ўжо дзевятнаццаць год мёртвы. Такі яшчэ малады, прыгожы, халодны.

І праз месяц мой дзень нараджэння. Стукне мне сорак сем. І, значыцца, ужо дваццаць год буду я парыць родную зямельку-маці.

Кнігі адтуль буду пісаць, закахаюся няўдала, з жонкай пазнаёмлюся, убачу многіх людзей, добрых і благіх. І ў Варшаву паеду адтуль.

Што ж мне рабіць? Хто ўратуе?

Калі надрукуюць гэтае маё пасмяротнае рыданне — ганарар за яго прашу пераслаць у пекла, рад апошні, квартал пяцьдзесят восем. Люцыпаровічу. Можа, хоць менш дроваў падкіне пад злашчасны, перадчасны мой кацёл.

…Ратуйце, людзі…

notes

Примечания

1

Указанне імя Георгій у дачыненні да Скарыны ў пазнейшых публікацыях У. Караткевіча, у тым ліку і ў перапрацаваным артыкуле ў "Ніве" за 6 жніўня 1967 г., адсутнічае. Сустракаецца толькі навукова даказанае імя — Францыск (Францішак).